Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЎТОРАК
21 красавіка 1931 г.
№ 92 (3180)

ГАЗЕТЫ
Национальная библиотека Беларуси
Минская Беларусь
Москва 3 Публичная
эка СССР им. Ленина
ЦК. адвін ек

Ударнікі калгасных палёў Крычаўшчыны-на сацыялістычнай пераклічцы

НАШ АДКАЗ ТУЛЬСКІМ РАБОЧЫМ МЫ ПЫТАЕМСЯ У АДСТАЮЧЫХ МЫ ЛІЧЫМ

Авяшчаем сябе ўдарнікамі імя 518 новых фабрык і заводаў, 1040 новых МТС, перакрываем сустрэчным плянам плян веснавой сяўбы, раён калектывізаваны на 40,5 пр., наш плян—55 пр. да выхаду ў поле

Чым тлумачыць, што Бабруйскі раён калектывізаваны толькі на 12,7 проц., Быхаўскі—16 пр., Рэчыцкі—11 пр., Гарадзецкі—7,6 проц.

што калгасьнікі гэтых раёнаў дрэнна папулярызавалі свае дасягненьні сярод аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў, не давялі ім фактамі і лічбамі перавагу калектыўнай гаспадаркі, слаба праводзіцца наступленьне на кулака, кулак не атрымлівае рашучага адпору

Калгасы БССР! Прымайце выклік крычаўцаў. Уступайце ў першамайскую пераклічку сацыялістычных перамог

Мы, прадстаўнікі калгасаў і аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў Крычаўшчыны, сабраўшыся на раённы зьлёт у колькасьці 200 чалавек, каб падагуліць папярэднія вынікі нашай падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны, з вялікай зацікаўленасьцю сустрэлі і абгаварылі адозву тульскіх рабочых заводу № 1. Буйнейшыя дасягненьні тульскіх рабочых і пэрспэктывы рашаючых перамог—пабудова 518 новых фабрык і заводаў, 1040 новых МТС у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі—выклікалі ў нас новы імпэт творчай актыўнасьці, накіраваны ў бой за рашаючыя перамогі сацыялізму.

Мы шпарка ідзём лад сьцягам генэральнай лініі партыі па шляху стварэньня буйных калгасаў і саўгасаў, якіх яшчэ ня бачыла гісторыя чалавецтва. На 1 красавіка г. г. мы ахапілі калгасамі 40,5 проц. усіх бядняцка-сераднякіх гаспадарак раёну. Частка сельсаветаў (Бацьвінаўскі, Баеўскі, Шаляцінскі) набліжаюцца да суцэльнай калектывізацыі і да ліквідацыі на яе аснове кулацтва як клясы. У сёлетнім годзе МЫ ДАЕМ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН веснавой сяўбы. Задань не Наркамзему БССР—пашырыць пасеўную плошчу яравых культур на 25 проц., мы перакрываем сустрэчным і пашыраем на 27,7 проц. супроць мінулага году. Да пасеўнай кампаніі мы ўжо ў асноўным завяршаем падрыхтоўку. Насенны фонд па зярнёвых і бабовых культурах мы ссыпалі на 111 проц. да пляну. Страхавы фонд сабралі на 110 проц., рамонт інвэнтара так сама закончваем. Усе калгасы і аднаасобнікі закантрактавалі свае пасевы, мы ў тэрмін выканалі плян кантрактацыі на 138 проц. Плян вапнаваньня глебы наш раён па абодвых сэкстарах выканаў на 155 проц., вывезена мінэральнага ўгнаеньня на 90 проц. да пляну. Закончваем перавод усіх калгасаў на зьдзельную працу.

Зараз мы ўсю ўвагу сканцэнтравалі вакол разгортваньня жывёлагадоўлі і вырашэньня мясной праблемы. За 1930 год мы арганізавалі 10 прамыслова-сьвінагадоўчых калгасаў, якія ўжо на 1 студзеня г. г. мелі 620 сьвінаматак. У 1931 годзе ў нас будзе 23 прамысловых сьвінарнікі, у якіх будзем гадаваць 2000 сьвінаматак.

У гэтым-жа годзе

МЫ МЯРКУЕМ ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ 4750 ТАВАРНЫХ ПАДСЬВІНАКАЎ, АЛЬБО 3800 цэнтн. СЬВІНІНЫ. Ужо ў бліжэйшы час калгас «Чырвоны Партызан» здасьць дзяржаве 100 ГАЛОЎ АДКРОМНЫХ СЬВІНЕЙ.

Пад кіраўніцтвам раённай партыйнай арганізацыі мы ўвесь час рашуча змагаліся і змагаемся з кулацтвам і яго агентамі за кожны калгас і кожнага новага калгасьніка. Брыгады нашых калгасьнікаў амаль усю зіму разьяжджалі па вёсках і змагаліся за ўцягненьне аднаасобнікаў у калгасы. Каб замацаваць новыя калгасы мы пасылалі ў іх старых калгасьнікаў для перадачы вопыту арганізацыі працы. Зараз у нас шырока разгарнулася шэфства старых калгасаў над маладымі. Наладзілі па між сабой ўзаемную адказнасьць за пасьпяховае выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

А як у вас

ТАВАРЫШЫ КАЛГАСЬНІКІ, ІНШЫХ РАЁНАЎ БССР, ЦІ ПАДРЫХТАВАНЫ ВЫ ДА СЯЎБЫ? ЯК У ВАС РАСТУЦЬ КАЛГАСЫ? ЦІ ВЕДАЮЦЬ КАЛГАСЬНІКІ АБ ЛІЧБАХ РОСТУ САВЕЦКАЙ КРАІНЫ?

Мы атрымалі зьвесткі з цэнтральных газэт, што па радзе раёнаў у падрыхтоўцы да 2 бальшавіцкай вясны маюцца вялікія прарывы. Чым тлумачыцца, што ў БАБРУЙСКІМ раёне дасягнулі толькі 12,7 проц. калектывізацыі, у БЫХАЎСКІМ—16 проц. у РЭЧАЦКІМ—11 проц., ГАРАДЗЕЦКІМ—7,6 проц.? МЫ ЛІЧЫМ, што калгасьнікі гэтых раёнаў дрэнна папулярызавалі свае дасягненьні сярод аднаасобнікаў і не давялі ім фактамі і лічбамі перавагі калектыўнай гаспадаркі, а таксама слаба праводзіцца наступленьне на кулацкія элемэнты.

Рад раёнаў амаль праваліл кантрактацыю яравых пасеваў. У тымжа БАБРУЙСКІМ раёне калгасьнікі і аднаасобнікі выканалі свае задань ні толькі на 39,4 проц.У БЫХАЎСКІМ раёне калгасы закантрактавалі толькі 10—11 проц., а па аднаасобным сэктары зусім сарвана кантрактацыя. Наш сусед—ЧЭРЫКАЎСКІ раён таксама адстае ў правядзеньні кантрактацыі—дасягнуў толькі 40 проц. выкананьня пляну.

ТАВАРЫШЫ КАЛГАСЬНІКІ І АДНААСОБНІКІ, БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ АДСТАЮЧЫХ РАЁНАЎ, НЯЎЖО ВЫ З ТАКІМІ ГАНЕБНЫМІ ЛІЧБАМІ ПА КАНТРАКТАЦЫІ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ВЫЕДЗЕЦЕ Ў ПОЛЕ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ СЯЎБЫ? НЯЎЖО-Ж ВЫ ТАКІМІ ЛІЧБАМІ Ў МІЖНАРОДНАЕ СЬВЯТА 1 МАЯ БУДЗЕЦЕ РАПАРТАВАЦЬ РАБОЧЫМ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ?

Мы спадзяемся,

што вы зьнімеце з сябе чорную пляму і станеце ў рады байцоў за суцэльную калектывізацыю. Мы вітаем з буйнымі перамогамі калгасьнікаў КЛІМАВІЦКАГА І ЛЕПЕЛЬСКАГА РАЁНАЎ. ЯНЫ ЎЖО ЎЦЯГНУЛІ Ў КАЛГАСЫ ЗВЫШ 50 ПРОЦ. БЯДНЯЦКІХ І СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК СВАІХ РАЁНАЎ. ВОСЬ АД ІХ ВАМ ТРЭБА ЎЗЯЦЬ ПРЫКЛАД І ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЦЦА з кулацтвам за кожны новы КАЛГАС, ЗА КОЖНАГА НОВАГА КАЛГАСЬНІКА.

Ёсьць і ў нас месцамі вялікія прарывы. Па ЗАРУБЕЦКІМ, БЕЛЬСКІМ, КАШАНСКІМ, ПАЛЕНІЦКІМ сельсаветамі ахоплена калгасамі толькі ад 11 да 20 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак. У асобных новых калгасах яшчэ ня поўнасьцю сабраны насенныя і страхавыя фонды і ня ўсюды выкінуты кулацкія элемэнты з калгасу. Але-ж гэты прарыў мы ліквідуем. Мы бярэм на сябе абавязацельства да выхаду ў поле ДАВЕСЬЦІ ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ДА 55. У выкананьне гэтай задачы наш зьлёт ухваліў паслаць у адстаючыя па калектывізацыі сельсаветы яшчэ раз свае ўдарныя брыгады.

Да сяўбы засталіся лічаныя дні

Мы зьвяртаемся да кожнага бедняка і сераднякa аднаасобніка, як нашага раёну, так і ўсяе БССР, паскорыць адказ на запытаньне з КІМ ВЫ: з вуланом ці з калгасам. МЫ НАПАМІНАЕМ РАШЭНЬНІ VI-га ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ, ЯКІ СКАЗАЎ, ШТО «ТОЛЬКІ ТОЙ БЯДНЯК І СЕРАДНЯК АДНААСОБНІК ПРАЦЯГВАЕ ЗАСТАВАЦЦА САЮЗЬНІКАМ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ, ХТО СУМЕСНА З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ ДАПАМАГАЕ БУДАВАЦЬ КАЛГАСЫ, ХТО ПАДТРЫМЛІВАЕ КАЛГАСНЫ РУХ, ХТО ДАПАМАГАЕ ВЕСЬЦІ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ».

Таварышы беднякі і сераднякі, ЗАРУБЕЦКАГА, БЕЛЬСКАГА, КРЫЧАЎСКАГА, ПАЛЕНІЦКАГА І КАШАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТАЎ, няўжо для вас яшчэ не ясна, што адзіны верны шлях—ГЭТА ШЛЯХ КАЛГАСАЎ! Нельга далей адцягваць вашае ўступленьне ў калгасы, бо вы ня толькі перашкаджаеце найбольш хутка будаваць соцыялістычную гаспадарку, але і шкодзіце самі сабе: вы не скарыстоўваеце тых вялікіх ільгот, што даюцца дзяржавай калгасам і калгасьнікам.

Таварышы калгасьнікі калгасу «ПЕРАМОГА» (в. Асавец), «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» (Бельскі сельсавет), «III ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» (Паляніцкі сельсавет), вы АДСТАЕЦЕ ад перадавых калгасаў нашага раёну Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СЯЎБЫ! У вас НЯ ЗЬНІШЧАНЫ СПАЖЫВЕЦКІЯ НАСТРОІ, ДРЭННА АРГАНІЗАВАНА ПРАЦА, МАЕЦЦА ВЯЛІКАЯ БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ! Сучасная ваша работа кладзе чорную пляму на вашу агульную калектыўную сям'ю.

Мы патрабуем ад вас

неадкладна ЗМЫЦЬ гэту ГАНЕБНУЮ ПЛЯМУ і стаць паказальнымі калгасамі ў раёне. МЫ РАІМ ВАМ УЗЯЦЬ ПРЫКЛАД З КАЛГАСАЎ «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН», «НА ВАРЦЕ», «ЗАРА», ЯКІЯ з гонарам справіліся з гаспадарчымі задачамі і ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

Ад імя ўсіх калгасаў наш зьлёт прад'яўляе рахунак Крычаўскаму фасфарытнаму заводу.

Таварышы фасфарытнікі

ВЫ НЕ ДАДАЛІ НА КАЛГАСНЫЯ ПАЛІ ТЫСЯЧЫ ТОН ФАСФАРЫТНАЙ МУКІ! За 1930 год вы сваю праграму ня выканалі. За першы квартал бягучага году вы ледзь выканалі плян на палову і таксама не дадалі фасфарытнай мукі звыш тысячы тон. Зараз у нас не хапае мінэральнага ўгнаеньня, каб выканаць пляны пасеўнай кампаніі.

Таварышы рабочыя і работніцы фасфарытнага заводу, ВЫ ТАКСАМА НЯСЕЦЕ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ЎЗДЫМ УРАДЖАЙНАСЬЦІ НА НАШЫХ ПАЛЕХ!

Дзе ваша геройства і мужнасьць для змаганьня?

Чаму вы

НЕ ЎЗЯЛІ ТАКІХ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ ЯК ТУЛЬСКІЯ РАБОЧЫЯ? МЫ ЧАКАЕМ КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ Ў ВАШАЙ РАБОЦЕ. НАПРУЖЦЕ ЎСЕ СІЛЫ, ТРЭБА З ПОСЬПЕХАМ ВЫКАНАЦЬ ПРАГРАМУ 3-га РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ!

Лічбы рашаючых перамог ня могуць ня выклікаць новага выбуху творчай актыўнасьці ў рабочых і калгасных мас. НАШ ЗЬЛЁТ АБВЯШЧАЕ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ ІМЯ 518 НОВЫХ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ, ІМЯ 1040 НОВЫХ МТС І БЯРЭ НА СЯБЕ АБАВЯЗАК ЗАВЕРБАВАЦЬ У РАДЫ ЎДАРНІКАЎ КОЖНАГА КАЛГАСЬНІКА І КАЛГАСЬНІЦУ НАШАГА РАЁНУ.

Мы бярэм на сябе абавязак

Зварочваемся да ўсіх калгасьнікаў Крычаўшчыны і калгасьнікаў БССР АДПРАЦАВАЦЬ КОЖНАМУ ПРАЦАЗДОЛЬНАМУ ПА 7 ДЗЁН НА КАРЫСЬЦЬ ПАБУДОВЫ МТС У 1931 Г. Разам з гэтым МЫ ЗЬВЯРТАЕМСЯ ДА ЎСІХ НАВУКОВЫХ УСТАНОЎ І НАШЫХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ РАСПРАЦАВАЦЬ ДЛЯ КАЛГАСАЎ АГРА-МІНІМУМ ВЕДАЎ, ДАЦЬ МАСТАЦКУЮ ЛІТАРАТУРУ, ЯКІЯ-Б БЫЛІ ЗРАЗУМЕЛЫ ДЛЯ КОЖНАГА, НАВАТ, МАЛАПІСЬМЕННАГА КАЛГАСЬНІКА. ДАЙЦЕ НАМ КНІЖКУ, ЯКАЯ-Б АДБІВАЛА НАШЫ ДАСЯГНЕНЬНІ І ПЕРАМОГІ НА ФРОНЦЕ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА!

УСТАНОВІМ САПРАЎДНУЮ ЎЗАЕМНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ПАМІЖ УСІМІ ГАСПАДАРЧЫМІ І КУЛЬТУРНЫМІ АДЗІНКАМІ НАШАЙ КРАІНЫ!

ПАД СЬЦЯГАМ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ УсеКП(б), МЫ ДАБІЛІСЯ РАШАЮЧЫХ ПЕРАМОГ, ПАД ГЭТЫМ-ЖА СЬЦЯГАМ МЫ ЗАКЛІКАЕМ КАЛГАСЬНІКАЎ, БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ АДНААСОБНІКАЎ УСЯЕ БЕЛАРУСІ Ў БОЙ ЗА НОВЫЯ ПЕРАМОГІ.

НЯХАЙ ЖЫВЕ УсеКП(б) І ЯЕ ПРАВАДЫР ТАВ. СТАЛІН!

ПА ДАРУЧЭНЬНІ РАЁННАГА ЗЬЛЁТУ—ПРЭЗЫДЫУМ.

Ленінізм перамагае

22 красавіка—дзень нараджэньня правадыра сусьветнага пралетарыяту тав. Леніна.

Гэтая дата, нараджэньня вернага пасьлядоўцы Маркса і Энгельса, правадыра сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, запісана на баявых чырвоных штандарах сусьветнага пралетарыяту, які пад кіраўніцтвам III Камуністычнага Інтэрнацыяналу змагаецца за пралетарскую дыктатуру ва ўсім сьвеце. Пралетарыят капіталістычных краін узброіўшыся марксысцка-ленінскай тэорыяй пад кіраўніцтвам сваіх кампартый штурмуе цьвярдыні капіталу. І блізіцца той час, калі капіталізм будзе зьвергнуты ў сьметнік, даўно падрыхтаваны для яго гісторыяй.

Капіталістычны сьвет ідзе гіганцкім крокам да свайго канчатковага краху. Сусьветны эканамічны крызіс, які ўжо перарос і перарастае ў палітычны, з кожным днём ахапляе сабой адну капіталістычную краіну за другой. Шматмільённыя армії беспрацоўных, жорсткая эксплёатацыя рабочай клясы, адкрытае рабаўніцтва калёніяльных народаў—вось што зараз зьяўляецца характарным для кожнай капіталістычнай краіны.

Сусьветная буржуазія ўсімі сіламі імкнецца затрымаць далейшае разгортваньне эканамічнага і палітычнага крызісу. Сусьветная буржуазія імкнецца знайсьці які-небудзь выхад з таго становішча, у якім яна апынулася ў выніку крызісу. Гэты выхад сусьветная буржуазія знаходзіць у арганізацыі яшчэ больш рашучага наступу на пралетарыят, які прымушан пакуль-што на сваіх плячох выносіць галоўную цяжкасьць сусьветнага крызісу. Видучы шалёны наступ на рэвалюцыйны пралетарыят, міжнародная буржуазія ўсё больш і больш пачынае непакоіцца існаваньнем краіны будучай сацыялізм—СССР.

СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, перамагаючы ўсе перашкоды і труднасьці на сваім шляху пасьпяхова будуе сацыялізм. Мільёны рабочых, калгасных і бядняцка-сераднякіх мас краіны саветаў паставілі перад сабою баявую задачу—выканаць у найхутчэйшы тэрмін заветы свайго правадыра тав. Леніна. СССР з крэпкі аграрна адсталай ходкімі тэмпамі ператвараецца ў перадавую індустрыяльна-калгасную краіну.

Пяцігодка краіны саветаў зрабілася сьцягам для рабочай клясы і працоўных усяго сьвету. Першыя два гады барацьбы за пяцігодку далі вялізарныя станоўчыя палітычныя вынікі. Гэтыя вынікі зводзяцца да таго, што пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва ня толькі выконваецца, але і па цэлым радзе галін перавыконваецца, што адбыліся вялізарныя нябачныя зрухі ў палепшаньні матар'яльнага і культурнага становішча рабочае клясы, поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе, што па баявому вырашана зарнёвая праблема, што асноўныя масы сялянства канчаткова павярнуліся на шлях масавай калектывізацыі.

Атрыманыя перавагі ў выкананьні пяцігодкі за папярэдзія два гады далі магчымасьць ператварыць трэці год у год рашаючы, у год канчатковага завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Буйныя перамогі, дасягнутыя бакінскімі, грозьненскімі і тульскімі пралетарамі, узьнімаюць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва на недасяжную вышыню. 518 буйных гігантаў сацыялістычнай індустрыі, 1040 МТС павінны быць пушчаны ў ход на працягу 1931 году. Зараз увага рабочае клясы, калгасных і бядняцка-сераднякіх мас згуртавана на выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну трэцяга рашаючага году і гэтае перавыкананьне будзе зьяўляцца адным з вялізарнейшых укладаў у перамогу ленінізму.

Побач з вялізарнейшымі дасягненьнямі на фронце гаспадарчага будаўніцтва атрыманы ня менш значныя посьпехі і на фронце культурнага будаўніцтва. Ленін у 1923 годзе ў артыкуле «Аб каапэрацыі» пісаў: «Для нас дастаткова цяпер гэтай культурнай рэвалюцыі для таго, каб аказацца палкам сацыялістычнай краінай. Але ў нас гэтая культурная рэвалюцыя прадстаўляе неймаверныя труднасьці і чыста культурнай уласьцівасьці (бо мы няпісьменныя) і ўласьцівасьці матар'яльнага (бо для таго, каб быць культурнымі, патрэбна вядомае разьвіцьцё матар'яльных сродкаў вытворчасьці, патрэбна вядомая матар'яльная база)». Ці ёсьць у нас зараз спрыяючыя ўмовы для выкананьня гэтага ленінскага завету аб культурнай рэвалюцыі? Гэтыя ўмовы ня толькі ёсьць, але яны ўжо створаны і культурная рэвалюцыя зараз ідзе ў нагу з ударнымі тэмпамі ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва.

На аснове ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, акраіны народнасьці, якія пры царызьме былі асуджаны на галоднае выміраньне, зараз пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пасьпяхова будуюць сваю гаспадарку, упоўнена і цьвёрда ідуць па шляху стварэньня культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце. БССР, як і ў галіне гаспадарчага будаўніцтва, так і асабліва ў галіне культурнага будаўніцтва, дамаглася вялікіх посьпехаў. Гэтыя посьпехі, якія БССР атрымала ў галіне будаўніцтва народнае гаспадаркі і стварэньня культуры нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце, характарызуюцца шпаркім ростам сеткі ВТНУ, ВНУ, тэхнікумаў, сямігодак, пачатковых школ, тэатраў, і розных культурна-сацыяльных устаноў, якімі абслугоўваюцца ўсе нацменшасьці на іх роднай мове.

Шырокі сацыялістычны наступ па ўсім фронце выклікае шалёнае супраціўленьне клясавага ворага Клясавы вораг у барацьбе супроць пралетарскай дыктатуры, выкарыстоўвае розныя мэтады і спосабы. Стрэл з абрэзу ў лепшых прадстаўнікоў партыі і ўлады, шкодніцтва на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, простая дапамога ў падрыхтоўцы глебы для інтэрвенцыі, для зьвяржэньня савецкай улады і рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне—вось той ланцут, якім скованы зараз унутраныя і зьнешнія ворагі краіны саветаў.

Гэтыя вялізарнейшыя посьпехі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва атрыманы ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, ва ўмовах бязьлітаснага змаганьня з правым ухілам і «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх. Ленінская партыя кіруючыся рэвалюцыйнай тэорыяй свайго правадыра на шчэнт разьбіла контр-рэвалюцыйны трацкізм і з усёй рашучасьцю павяла барацьбу з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе і «левымі» загібамі, з усімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі.

Супраціўленьне клясавага ворага—кулака сацыялістычнаму наступленьню, якое разгортваецца ўсё шырэй і шырэй па ўсім фронце, знаходзіць свой адбітак і ў пытаньні ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Яскравым прыкладам супраціўленьня клясавага ворага пасьпяховаму ажыцьцяўленьню ленінскай нацыянальнай палітыкі зьяўляецца вылазкадзяржаўны шавінізм, які ўяўляе сабою галоўную небясьпеку на даным этапе, беларускі контр-рэвалюцыйны нацыянал - дэмакратызм і шавінізм усіх колераў і адценьняў. Клясавы вораг праз сваю агентуру нацыянал-апартуністаў, беларускіх контррэвалюцыйных нацдэмаў імкнуўся, а ў некаторых выпадках і выкарыстаў рад гаспадарчых і культурных вучасткаў у апідных мэтах, у мэтах барацьбы супроць пралетарскай дыктатуры і падрыхтоўкі глебы для інтэрвэнцыі, для рэстаўрацыі капіталізму ў нашай краіне. Але-ж стаўка беларускай контр-рэвалюцыі біта. Рабочыя і працоўныя масы БССР, узброеныя ленінскім вучэньнем, пад кіраўніцтвам КП(б)Б упэўнена і цьвёрда ідуць да канчатковай перамогі.

Ленінізм перамагае. Ленінізм стаў блізкім і зразумелым для пралетарыяту і працоўных усяго сьвету. У агні клясавых боек пралетарыяту з капіталам выкоўваецца непарушная воля да барацьбы за пралетарскую дыктатуру ва ўсім сьвеце. Ленін—сымбаль барацьбы ўсіх эксплёатуемых і прыгнечаных супроць капіталу, сымбаль барацьбы за сваё вызваленьне.

Няхай капіталісты ўсяго сьвету і іх лёкаі сацыял-здраднікі і сацыял-лёкаі ўсіх колераў, памоў-інтэрвэнцыяністы, прадажныя цапныя сабакі—Абрамовічы, Даны, Астроўскія і К° балбочуць аб тым, што краіна саветаў стаіць на шляху поўнага развалу, што краіна саветаў перажывае нябачны крызіс і заняпад. А пралетарыят, калгасныя і бядняцка-сераднякія масы сялянства Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам партыі Леніна яшчэ больш узьнімуць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ больш высока ўзьнімуць сьцяг сацпаборніцтва і ўдарніцтва і пойдуць па шляху далейшых перамог. Сусьветны пралетарыят пад кіраўніцтвам III Камуністычнага Інтэрнацыяналу, засна вальнікам якога быў Ленін, у барацьбе супроць сусьветнага фашызму загартуюць сябе для таго, каб узяць уладу ў свае рукі.

Ленінізм—сіла, якой няма роўнай у сьвеце. Ленінізм перамагае! Ленінізм пераможа!

Падтрымаць заклік калгасьнікаў Крычаўшчыны

Праз некалькі дзён — міжнароднае сьвята працы, дзень агляду баявой гатоўнасьці пралетарыяту і працоўных усіх краін да барацьбы супроць капіталізму, за сацыялізм, за камунізм.

У гэты дзень вуліцы гарадоў капіталістычных краін будуць затоплены жалезнымі калёнамі пралетараў і пралетарак. Ва ўмовах жорсткага ўсё паглыбляючагася эканамічнага крызісу ў капіталістычных краінах будзе праходзіць гэта сьвята. Узрокі рабочых усяго сьвету і прыгнечаных працоўных калёній ў гэты дзень будуць зьвернуты да СССР, да бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту, да цытадэлі сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Друкуемая сёньня адозва зьлёту калгасьнікаў і аднаасобнікаў Крычаўшчыны да ўсіх калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў Крычаўскага раёну і ўсёй БССР—яскравейшы прыклад уздыму энтузіязму на фронце будаўніцтва сацыялізму. Калгасьнікі Крычаўшчыны маюць сур'ёзныя і вялікія дасягненьні. Яны цалкам сабралі і ссыпалі насенныя і страхавыя фонды. Яны адрамантавалі ўвесь інвэнтар. Разам з аднаасобнікамі яны перавыканалі плян кантрактацыі яравых. Яны заканчваюць перавод калгасаў на зьдзельшчыну. Яны пасьпяхова вырашаюць жывёлагадоўчую праблему.

Толькі выконваючы генэральную лінію партыі, толькі рашуча змагаючыся з кулацтвам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі, дабіліся калгасы Крычаўшчыны такіх посьпехаў. І яны ў праве зьвярнуцца да калгасаў іншых раёнаў БССР, каб запытацца—ці падрыхтаваны яны да сяўбы, ці зрабілі яны ўсё для ўцягненьня беднякоў і сераднякоў у калгасы. Калгасьнікі Крычаўшчыны зьвяртаюцца да калгасьнікаў і аднаасобнікаў беднякоў і сераднякоў адстаючых раёнаў БССР з пытаньнем—аб чым вы будеце рапартаваць рабочым фабрык і заводаў у день 1 мая.

Калгасы Крычаўшчыны патрабуюць ад кожнага бедняка і сераднякa—аднаасобніка паскорыць з адказам на запытаньне—за, ці супроць яны калгасаў? Калгасы Крычаўшчыны зьвяртаюць увагу рабочых Крычаўскага фасфарытнага заводу на тое, што яны ня выканалі сваёй праграмы, не дадалі калгасным палём звыш 1.000 тон фасфарыту. Напружыць усе сілы, зрабіць карэнны пералом, дабіцца сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў, выканаць праграму трэцяга рашаючага.

Калгасы Крычаўшчыны абвяшчаюць сябе ўдарнікамі імя 518 новых фабрык і заводаў, імя 1040 новых МТС. Яны ўзялі на сябе абавязак завербаваць у рады ўдарнікаў усіх да аднаго калгасьніка і калгасьніцу.

Калгасы Крычаўшчыны зьвяртаюцца да ўсіх калгасьнікаў, да ўсіх аднаасобнікаў, беднякоў і сераднякоў БССР каб яны падтрымалі іх заклік, каб запаліліся такім аснём энтузіязму, як яны, каб спаткалі 1 мая магутным уздымам творчага запалу. Беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў яны заклікаюць хутчэй уступіць у калгасы, рабочых—выканаць і перавыканаць свае прамфінпляны. Калгасы Крычаўшчыны заклікаюць рашуча змагацца за генэральную лінію партыі, узмацніць наступленьне супроць кулакоў, узмацніць барацьбу супроць яго агентуры—правых і «левых» апартуністаў.

Рабочыя, калгасьнікі, беднякі і сераднякі БССР, вы павінны зараз-жа адказаць на заклік Крычаўскіх калгасьнікаў.

Вы павінны ўключыцца ў першамайскую пераклічку сацыялістычных перамог прадпрыемстваў і калгасаў. Вы павінны поўнасьцю выканаць прамфінплян, цалкам закончыць пераход на зьдзельшчыну, арганізаваць брыгады імя 518 і 1040, яшчэ больш разгарнуць работу па ўцягненьні ў калгасы беднякоў і аднаасобнікаў, быць гатовымі да бальшавіцкай сяўбы.

Аднаасобнікі—беднякі і сераднякі! Новым магутным уздымам калгаснага прыпыву яшчэ больш рашучай барацьбой за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як клясы адзначце дзень 1 мая.

Заўтра рабочыя і працоўныя ня толькі СССР, а і ўсяго сьвету будуць адзначаць 61 гадавіну нараджэньня генія пралетарскай рэвалюцыі У. І. Леніна. Ленінскія дні будуць адзначаны яшчэ большым уздымам творчага энтузіязму рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, яшчэ большай барацьбой за выкананьне і перавыкананьне плянаў 3-га рашаючага году, барацьбой за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе падставе кулацтва, як клясы.

ШЫРЭЙ БУДАЎНІЦТВА САВЕЦКІХ ДЫРЫЖАБЛЯЎ

Гадавіну нараджэньня правадыра Ўл. І. Леніна, дзень 1-га Мая адзначым пасіленьнем папулярызацыі значэньня савецкага дырыжаблябудаўніцтва, пасіленьнем збору сродкаў на яго



У адзнаку дня нараджэньня правадыра

Разгортваньне савецкага дырыжаблябудаўніцтва зьяўляецца адным з сур'ёзьнейшых і неадкладных задач рабочае клясы і ўсіх працоўных Савецкага Саюзу. На сёньнешні дзень амаль кожнаму працоўнаму Савецкага Саюзу ясна тая роля, якую адыгрывае дырыжабль у сацыялістычным будаўніцтве, тая роля, якую ён будзе адыгрываць у часе абароны сацыялізму ад узброенага нападу сусьветных імпэрыялістаў. Зараз, калі ў краіне саветаў нябачанымі тэмпамі ідзе сацыялістычнае будаўніцтва, у якое ўцягнуты і акраіны, пытаньне сувязі цэнтру з далёкімі акраінамі адыгрывае вялізарную ролю. Лепшым сродкам хуткай сувязі—зьяўляецца дырыжабль. Дырыжабль зьяўляецца магутным сродкам барацьбы з палявымі шкоднікамі. Дырыжабль будзе адыгрываць ня малую ролю і ў тэй вайне, якую спрабуюць навязаць Савецкаму Саюзу сусьветныя імпэрыялісты, супроць якіх Савецкі Саюз змагаецца ўсімі сіламі і сродкамі.

Такім чынам, дырыжабль ёсьць сродак барацьбы за пабудову сацыялізму, за ахову яго ад сусьветных драпежнікаў, ёсьць сродак барацьбы за ўзмацненьне абароназдольнасьці СССР.

Вось чаму выклік газэты «Правды» спаткаў такі гарачы водгук з боку рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных, спаткаў падтрыманьне сіламі і сродкамі справы разгортваньня савецкага дырыжаблябудаўніцтва.

Заўтра канчаецца 61 год са дня нараджэньня вялікага правадыра сусьветнага пралетарыяту У. І. Леніна. Гэты дзень рабочая кляса і ўсе працоўныя Савецкага Саюзу адзначаць яшчэ большым узмацненьнем работы па выкананьні заветаў Уладзімера Ільліча—пабудове фундаманту сацыялістычнай эканомікі, па ўзмацненьні абароназдольнасьці СССР. Таксама адзначыць рабочая кляса і ўсе працоўныя дзень 1 мая.

Сьвяткаваньне дня нараджэньня У. І. Леніна і дня 1 мая будзе адбывацца ва ўмовах усё больш нарастаючай пагрозы вайны з боку капіталістаў супроць СССР, ва ўмовах, калі лёкай французскага імпэрыялізму—фашысцкая Польшча, усё мацней грыміць зброяй. Вось чаму гэтыя дні павінны быць адзначаны разгортваньнем работы па ўмацаваньні абароназдольнасьці СССР.

Узьнятая перадавымі рабочымі раду прадпрыемстваў Масквы ініцыятыва аб пабудове экскадрыльлі ДЫРЫЖАБЛЯЎ ІМЯ ЛЕНІНА павінна быць шырока падхоплена і падтрымана працоўнымі БССР. Поўнае выкананьне плянаў трэцяга рашаючага, магутны ўздым калектывізацыі, пабудава экскадрыльлі імя Леніна будзе лепшай адзнакай гадавіны нараджэньня Леніна, лепшай адзнакай 1 мая.

**Дырыжаблі «Ленін», «Сталін», «Стары Бальшавік», «Праўда», «Клім Варашылаў», «ТДА-Авіяхім» і «Калгасьнік» з гало

Па-ленінску змагацца за другую бальшавіцкую!

Правільная расстаноўка сіл і сродкаў вытворчасьці, зьдзельшчына, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, кантрактацыя яравых--асноўныя сродкі барацьбы за суцэльную калектывізацыю, рашаючыя вучасткі веснавой сяўбы

УДАРНАЙ КАЛГАСНАЙ КАЛЕНАЙ--ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ, НАНЯСЕМ РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТАХ--ПРАВЫХ І „ЛЕВЫХ" АПАРТУНІСТАХ

Рапартуе Талачыншчына

Арбітру ў сацспаборніцтве—рэдакцыі газэты «Савецкая Белар.»

На 1-га студзеня г.г. па Талачынскім раёне было калектывізавана 17,1 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, на 5-га красавіка г. г.—31,9 проц. Паасобныя сельсаветы раёну па калектывізаваны: Талачынскі на 44,5 проц., Плоскі—5,7 проц., Навасельскі—29,6 проц., Валасоўскі—12,8 проц., В.-Гарадзецкі—24,2 проц., Рыдамльскі—28,5 проц., Няклюдаўскі—22,3 проц., Сакалінскі—21,6 проц., Мархлеўскі—23,4 проц., Друцкі—35,1 проц., Азарыцкі—44,6 проц., Славенскі—46,2 проц., Слаўненскі—24,1 проц., Яўлахаўскі—20,3 проц., Воўкаўскі—55,4 проц.

Кантрактацыя яравых пасеваў выканана на гэтае чысло: лёну — 85,2 проц., канапель—124 проц., аўсу—75,6 проц., ячменю—67,6 проц., гароху—155,5 проц., крупяных культур—107,1 проц., бульбы 81,1 проц.

Страхавыя фонды створаны на 1 красавіка па калгасах на 50,9 проц., па аднаасобным сэктары—25 проц.

Мы лічым гэтыя дасягненні зусім недавальняючымі. РВК ужыў захады для выканаўня і перавыканаўня плянаў на цэлым радзе мерапрыемстваў, ён уключыўся ў двухдэкаднік генэральнай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы, у вёску накіравана 52 працаўнікі з раённага актыву для ліквідацыі прарываў.

Мы заклікаем Коханаўскі раён выступіць з сваім рапартам.

Старшыня РВК Гаўрасеў.
Сакратар Шаршун.

Баярскі сельсавет закончвае суцэльную калектывізацыю

Дзякуючы чотнаму партыйнаму кіраўніцтву і прыкладна пастаўленай ра боце раней арганізаваных калгасаў, Баярскі сельсавет, Полацкага раёну ідзе па шляху да суцэльнай калентывізацыі.

У сучасны момант сельсавет калектывізаваны на 92 проц.. Замест раней існаваўшых трох калгасаў зараз налічваецца сем моцных калектыўных гаспадарак.

Калгасны прыліў па сельсавеце працягваецца. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі групамі падаюць заявы аб уступленьні ў калгасы.

Брыгада «Савецкай Беларусі» ХАДКЕВІЧ І Я. САЎЧАНКА.

Кантрактацыю яравых

праводзім па ўдарнаму

У Ельскім раёне брыгада рабселькораў арганізавала рэйд па пытаньні правядзеньня кантрактацыі яравых культур на раёне. На 12 красавіка плян па кантрактацыі ярыны выкананы на 99 проц., аўса—88 проц., сена 90 проц., крупяных культур—107 проц., ячменю—70 проц., лубіну, канюшыны і канапель—да 50 проц.

Дасягненьні ў галіне кантрактацыі яравых культур па Ельскім раёне атрыманы дзякуючы таму, што была праведзена дастатковая работа сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Для правядзеньня гэтага мерапрыемства былі накіраваны ў вёску раённыя работнікі, студэнты БДУ і сельска-гаспадарчай акадэміі, якія правялі значную работу сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Правядзеньне кантрактацыі выклікала шалёнае супраціўленьне з боку кулацтва. У Стара-Высоцкім сельсавеце на хутары Забалоцьце заможнікі імкнуліся сарваць сход, толькі па тэй прычыне, што прадстаўнік РВК адмовіўся кантрактаваць пасевы ў кулацкіх гаспадарках (ім даюцца цьвёрдыя заданьні па сяўбе), але вясковы актыў даў рашучы адпор выпадкам кулацтва.

Правядзеньне кантрактацыі цесна ўвязаны з калектывізацыяй. Сакратар райкому КП(б)Б тав. Нікалаёнак пры правядзеньні работы па кантрактацыі і арганізацыі кандыдацкай групы КП(б)Б у В.-Байкаўскім сельсавеце арганізаваў калгас з бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ударнік.

У Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

ПРА ВЫКАНАНЬНЕ ДЫРЭКТЫЎ АБ ДАЧЫ ЦЬВЁРДЫХ ЗАДАНЬНЯЎ ДЛЯ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК ПА ЛЁНАЗАГАТОЎКАХ

Заслухаўшы даклад Народнага Камісара Снабжэньня тав. Балціна, Пракурора Рэспублікі тав. Ляўкова і саклад прадстаўніка Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі тав. Вербы, пра выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб цьвёрдых заданьнях кулацка-заможным гаспадаркам па лёназагатоўках, Камісія Выкананьня пры СНК БССР лічыць устаноўленым невыкананьне гэтых дырэктыў Народным Камісарыятам Снабжэньня, сыстэмамі спажывецкай і сельска-гаспадарчай каапэрацыі значнай часткаю і раённых выканаўчых камітэтаў, што выяўляецца з наступных прыкладаў:

а) цьвёрдыя заданьні па ільнавалакну ў сярэднім па БССР даведзены толькі да 4,4 проц. гаспадарак, адносная вага якіх у агульным пляне лёназагатовак складае толькі 8 проц. Спатканьне па цьвёрдых заданьнях складае толькі 62,2 проц., што зьнижае фактычны ўдзел кулацка-заможных гаспадарак у лёназагатоўках да 4,9 проц.;

б) Крупскі, Смалявіцкі і Чачэрскі раённыя выканаўчыя камітэты ня выканалі дырэктыву ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў да 5--7 проц. агульнага ліку гаспадарак, ахапіўшы цьвёрдымі заданьнямі менш 1 проц. гаспадарак;

в) Гомельскі, Крупскі, Ляднянскі, Смалявіцкі, Чырвонаслабодзкі і Чачэрскі раённыя выканаўчыя камітэты ня выканалі дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб давядзеньні адноснай вагі загатовак па цьвёрдых заданьнях з кулацка-заможных гаспадарак да 12—15 проц. агульнага пляну, вызначыўшы для кулацка-заможных гаспадарак менш 3 проц. агульнага пляну лёназагатовак;

г) Петрыкаўскі, Нараўлянскі, Мазырскі, Копыльскі, Капаткевіцкі, Ляднянскі і Талочынскі раённыя выканаўчыя камітэты далі кулацка-заможным гаспадаркам заданьне па аб'ёму ў значна меншых разьмерах, чым бядняцка-серадняцкія гаспадаркі здалі ў парадку самаабавязнасьці;

д) Народны Камісарыят Снабжэньня не ажыцьцявіў канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва раёнамі ў справе давядзеньня цьвёрдых заданьняў па лёназагатоўках да кулацка-заможных гаспадарак, не забясьпечыў вывучэньня таго, як дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР праламляюцца ў сапраўднасьці і высьвятленьня прычын невыкананьня гэтых дырэктыў па паасобных раёнах, а таксама ня здолеў арганізавць да гэтага часу поўнага падліку ходу выкананьня цьвёрдых заданьняў і ня выканаў дадзеных яму дырэктыў аб арганізацыі цьвёрдай сыстэмы падліку ў раённых арганізацыях і ў цэнтры;

е) сыстэмы спажывецкай, і сельска-гаспадарчай каапэрацыі прымалі недапушчальна слабы ўдзел у давядзеньні і спатканьні цьвёрдых заданьняў і пераладжылі ўсю гэту работу на незавыя савецкія органы;

ж) арганізаваныя Пракуратурай судовыя працэсы ў раёнах па прыцягненьні да адказнасьці кулацка-заможных гаспадарак, якія зрывалі здачу лёну, а таксама некаторых раённых і сельскіх працаўнікоў, якія злачынна слаба праводзілі працу па лёназагатоўках, у значнай частцы не насілі грамадзка - паказальнага характару. У шэрагу выпадкаў народныя суды падыходзілі да разгляду спраў кулацка-заможных гаспадарак, за нездачу лёну на цьвёрдых заданьнях суха, фармальна, недаацэньваючы палітычнага і гаспадарчага значэньня справы, а цэнтральны друк недастаткова асьвятліў мер ужытых Пракуратураю ў дачыненьні да асоб, вінаватых у зрыве лёназагатовак.

Баручы пад увагу паказанае вышэй, Камісія Выкананьня пры СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, якія ня выканалі дырэктыў Партыі і Ўраду па цьвёрдых заданьнях кулацка-заможным гаспадаркам у дачыненьні да іх удзелу ў агульным пляне лёназагатовак, пад адказнасьць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў на працягу 5-ці дзён выканаць гэтыя дырэктывы.

2. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам, пад адказнасьць старшынь, ажыцьцявіць рэальныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі дасканалую пастаноўку падліку ходу выкананьня цьвёрдых заданьняў з тым, каб да 25 красавіка ўсе весткі аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў па ўсіх відах загатовак былі дасланы Народнаму Камісарыяту Снабжэньня.

Наркамснабу ўстанавіць спэцыяльны нагляд за выкананьнем гэтае пастановы.

3. Прапанаваць Пракурору Рэспублікі тав. Ляўкову: а) на працягу 5-ці дзён прыцягнуць да адказнасьці тых працаўнікоў, якія парушылі дырэктывы СНК аб дачы цьвёрдых заданьняў; б) у выпадку не падачы Наркамснабу да 25 красавіка памянёных у арт. 2 вестак прыцягнуць да адказнасьці і раённых інспэктароў снабжэньня.

4. Прапанаваць Народнаму Камісару яту Снабжэньня, пад адказнасьць тав. Балціна, неадкладна ажыцьцявіць шэраг мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва Наркамснабу работаю раёнаў па загатоўках.

5. Прапанаваць Белкаапсаюзу пад адказнасьць т. Хаскіна, Беллёнакананпляводсаюзу пад адказнасьць тав. Лаціса, Белмалжывёлсаюзу пад адказнасьць т. Жаромскага і Белсадгародсаюзу пад адказнасьць т. Панамарова, на працягу 5-ці дзён ужыць канкрэтныя захады да забясьпечаньня ўдзелу ўсяе сыстэмы загатоўчых органаў на раёне ў справе давядзеньня цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак, іх спагнаньня і арганізацыі падліку загатовак ад кулацка-заможных гаспадарак.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
М. Галадзед.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
Я. Элькін.

15 красавіка, 1931 г.
г. Менск.

Ня ўсе калгасы забясьпечаны вытворчымі плянамі

Полацкі раён на сёньня мае 94 калгасы, якія аб'ядноваюць звыш 30 проц. усіх аднаасобных гаспадарак на тэрыторыі Полаччыны. Ўсе гэтыя калгасы патрэбна ўзброіць канкрэтнымі вытворчымі плянамі, каб другую бальшавіцкую сяўбу правесьці дружна і арганізавана.

Тымчасам, ня ўсе яшчэ калгасы маюць распрацаваныя вытворчыя пляны, ня ўсе калгасы перайшлі на зьдзельшчыну, не правялі гэтага важнейшага мерапрыемства, якое забясьпечвае пасьпяховасьць правядзеньня сяўбы. З 94 калгасаў толькі 80 ужо маюць вытворчыя пляны. Райкалгасаюз толькі ў апошні час мабілізаваў некалькі дзесяткаў працаўнікоў-спэцыялістаў для выпрацоўкі вытворчых плянаў у калгасах.

Дзе выпрацаваны вытворчыя пляны на час сяўбы, там разьмеркавана ўжо праца сярод калгаснікаў, вылучаны па асноўных галінах гаспадаркі брыгады, на кожную работу распрацоўваюцца каляндарныя пляны. Па гэтым пытаньні пры райкалгасаюзе былі праведзены спэцыяльныя курсы на 35 чалавек. Пры разьмеркаваньні працы асаблівая ўвага зварочваецца на зьнічэньне так званай абязьлічкі. У асноўным калгасы зразумелі значэньне гэтага мерапрыемства і прымацоўваюць інвэнтар, коняй і машыны да брыгадзіраў.

Слаба разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ўнутры саміх калгасаў. Нават такія буйныя калгасы, як «Чырвоная Зорка», «Чырвоны Артылерыст», калгас імя Сталіна не маюць сацыялістычных умоў паміж вылучанымі брыгадамі. Па прыкладу гэтых, можна сказаць перадавых, калгасаў ідзе і большасьць астатніх калгасаў раёну. На разгортваньне спаборніцтва, як магутнага рухавіка калгаснай работы, не заваграецца належнай увагі.

Увядзеньне зьдзельшчыны па раёне далёка яшчэ не закончана. Праведзена на зьдзельшчыну і то ня поўнасьцю каля 20 калгасаў. Калі такім тэмпамі будзе праводзіцца гэтая работа і далей, дык да вясны наўрад ці справяцца ўсе калгасы перайсьці на зьдзельную аплату працы.

Трэба адзначыць, што ўся справа ўпраецца ў недастатковую паваротлівасьць райкалгасаюзу, які ня здолеў да гэтага часу перабудаваць сваёй работы на ўдарныя рэйкі, каб чоткім бальшавіцкім кіраўніцтвам забясьпечыць выкананьне чарговых важнейшых задач у калгасах.

Брыгада «Савецкай Беларусі»: Хадкевіч і Я. Саўчанка.

Сельсавет ня кіруе кантрактацыяй

Кантрактацыя яравых культур па Крупшанскім сельсавеце, Крупскага раёну, зрываецца. Па некаторых вёсках кулацка-заможная частка выступае су проць кантрактацыі. У в. в. Самасеўка, Каралёва і іншыя па два разы склікаюцца сходы, але ў выніку агітацыі кулацтва пляны па кантрактацыі ня прымаюцца. Работнікі сельсавету, якія праводзілі гэтыя сходы, не змаглі даць рашучы адпор выпадкам клясавага ворага. Сельсавет ня прымае рашучых захадаў, каб зламаць супраціўленьне кулацка-заможнай часткі вёскі.

Трэба дабіцца поўнага выкананьня пляну кантрактацыі яравых па Крупшанскім сельсавеце.

Селькор К.

Камсамольскія ячэйкі—у баку ад кантрактацыі яравых

Кантрактацыя яравых культур па Пухавіцкім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Да гэтага часу нічога ня зроблена для папулярызацыі адозвы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, аб кантрактацыі яравых пасеваў 1931 г. Адозва не разглядалася на партыйных і камсамольскіх сходах, некаторыя камсамольцы, як напрыклад, з Кнорынскай камсамольскай ячэйкі, не ханелі ставіць гэтага пытаньня на агульным сходзе ячэйкі матывуючы гэта тым, што ведаюць зьмест адозвы; на справе-ж сказалася, што ніводзін з камсамольцаў нічога ня ведае пра адозву аб кантрактацыі ярыны.

Апартуністычна адносіцца да кантрактацыі камсамольцы і з Мар'іна-Горскай ячэйкі, якія да гэтага часу не паставілі пытаньне аб кантрактацыі на сваім сходзе.

Таксама нічога ня робяць у гэтай галіне студэнты Мар'іна-Горскага тэхнікуму.

РВК і РК ЛКСМ глядзяць на гэту справу скрозь пальцы. Трэба абвясьціць рашучую барацьбу апартуністычнай недаацэнцы кантрактацыі яравых. Кантрактацыя яравых культур 1931 г. павінна быць на раёне выканана.

А. Крушына.

Да сяўбы гатовы

Рапарт

аб становішчы калгасу імя газ. „Савецкая Беларусь" на 10 красавіка 31 г.

Бурлівая хваля калгаснага руху ахапіла 30 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак в. Вішанькі, Багуцінскага сельсавету, Ельскага раёну.

Лепшая частка бядняцка-серадняцкай масы калгасу 10 красавіка дэманстравала сваю баявую гатоўнасьць да другой бальшавіцкай вясны.

Калгас, арганізаваўшыся ў лютым месяцы г. г. з 14 гаспадарак, мае на сёньнешні дзень 35 гаспадарак, з якіх: 1 батрацкая, 10 бядняцкіх, 1 служачых, 11 маламоцных серадняцкіх і 12 серадняцкіх гаспадарак.

Усе калгаснікі падзелены на 5 брыгад для работы па ўсіх галінах гаспадаркі; вылучаны таксама старэйшыя брыгадзіры.

Насенны і страхавы фонд засыпалі цалкам. Мінэральнае ўгнаеньне завезена. Таксама адрамантаваны цалкам увесь сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Пасеўная плошча складаецца з 121 га. У сувязі з прылівам намечана дадатковая прырэзка зямлі.

Закантрактавана 22 га яравых засеваў.

Калгас мае 26 коняй, 3 валы. Для абагуленай рабочай жывёлы абстаўлена належным чынам стайня і пачата абсталяваньне другой стайні.

Сабрана ўступных узносаў звыш 300 руб

З боку сельсавету і старога калгасу «Чырвоная Зара» мы маем сваячасовую дапамогу абменам насеньня на гатунковае і пазыкаю насеньня, а таксама і кіруючую дапамогу.

Калгасная маса ўхваліла пастанову III зьезду калгасаў аб пераходзе на зьдзельшчыну. Аднак, да гэтага часу адсутнічае агранамічная дапамога, што перашкаджае правільна наладзіць арганізацыю працы ў калгасе і сваячасова скласьці вытворчыя пляны.

Калгас уступае ў барацьбу за новы магутны прыліў бядняцка-серадняцкіх мас і гаспадарчае замацаваньне калгасу.

Цесна згуртаваная сям'я калгаснікаў у штодзённай працы з гонарам апраўдае сваё пачэснае імя газэты «Савецкая Беларусь».

Ударная брыгада газ. «Савецкая Беларусь»: Газман І., Давыд І., Грыневіч А., Мазурэнка М., Грыневіч А., Грыневіч Л., Шаўчук С., Грыневіч У., Грыневіч Л., Грыневіч І., Захарэнка Н., Дашкевіч А., Грыневіч Я., Каленін Карней.

Апартуністычныя разважаньні, стаўка на самацёк—зрывае ўвядзеньне зьдзельшчыны ў Сьмілавіцкім р.

Калгасы Дукорскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну, яшчэ да сучаснага моманту зусім не займаюцца пытаньнямі зьдзельшчыны. Пераход калгасаў на зьдзельшчыну ня старшынь, ажыцьцявіць рэальныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі дасканалую пастаноўку падліку ходу выкананьня цьвёрдых заданьняў з тым, каб да 25 красавіка ўсе весткі аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў па ўсіх відах загатовак былі дасланы Народнаму Камісарыяту Снабжэньня.

Наркамснабу ўстанавіць спэцыяльны нагляд за выкананьнем гэтае пастановы.

3. Прапанаваць Пракурору Рэспублікі тав. Ляўкову: а) на працягу 5-ці дзён прыцягнуць да адказнасьці тых працаўнікоў, якія парушылі дырэктывы СНК аб дачы цьвёрдых заданьняў; б) у выпадку не падачы Наркамснабу да 25 красавіка памянёных у арт. 2 вестак прыцягнуць да адказнасьці і раённых інспэктароў снабжэньня.

4. Прапанаваць Народнаму Камісару яту Снабжэньня, пад адказнасьць тав. Балціна, неадкладна ажыцьцявіць шэраг мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва Наркамснабу работаю раёнаў па загатоўках.

5. Прапанаваць Белкаапсаюзу пад адказнасьць т. Хаскіна, Беллёнакананпляводсаюзу пад адказнасьць тав. Лаціса, Белмалжывёлсаюзу пад адказнасьць т. Жаромскага і Белсадгародсаюзу пад адказнасьць т. Панамарова, на працягу 5-ці дзён ужыць канкрэтныя захады да забясьпечаньня ўдзелу ўсяе сыстэмы загатоўчых органаў на раёне ў справе давядзеньня цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак, іх спагнаньня і арганізацыі падліку загатовак ад кулацка-заможных гаспадарак.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
М. Галадзед.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
Я. Элькін.

15 красавіка, 1931 г.
г. Менск.

Гомельшчына ўсё яшчэ цягнецца ў хвасьце

ГОМЕЛЬ, 19. (Наш. кар.). Усе кантрольныя тэрміны, устаноўленыя для правядзеньня асноўных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі для Гомельскага прыгараднага раёну, мінулі. Прыходзіцца канстатаваць, што раёны арганізацыі не забясьпечылі выкананьне гэтых мерапрыемстваў у тэрмін.

Пляны веснавой сяўбы даведзены да кожнага старога калгасу, але дрэнна абстаіць справа ў нованарганізаваных калгасах, а таксама індывідуальным сэктары. У апошнім меліся выпадкі, калі асобныя насельныя пункты (**Дуянаўка, Раманавічы**) не прынялі кантрольных лічбаў веснавой сяўбы. Асобныя сельсаветы спрабавалі нават зьменшыць гэтыя кантрольныя лічбы.

Насенных калгасных фондаў на 1-е красавіка т. г. сабрана 70 проц. заданьня, страхавых фондаў—50 проц. Страхавыя фонды ў аднаасобных гаспадарках на 1-е красавіка створаны толькі ў разьмеры 15 проц. заданьня.

Не забраніраваны поўнасьцю у калгасах фуражныя фонды.

Плян абмену на гатунковае насеньне па раёне выканан толькі на 18 проц.

Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара па калгасах і індывідуальным сэктары поўнасьцю ня скончаны. Яшчэ горш абстаіць справа з прасоўваньнем сельска-гаспадарчых машын у калгасы. На складзе Гаркаапсадсаюзу на 10-е красавіка ляжаць 58 плугоў 33 бораны, 4 культываторы, 444 асыпнікі, 16 сявярак, 15 жнівярак і інш. Тэмпы рэалізацыі машын слабыя.

З вызначанай плянам 531 тоны мінэральных угнаеньняў у раёне на сёньняшні дзень завезена ўсяго толькі 169 тон. Яшчэ горш з вапнаваньнем глебы у калгасах, пры чым тэпуе справу зрывае **Добруская фабрыка «Герой працы».** Даволі значны час таму назад Каапсаюз даў нарад фабрыцы адправіць раду калгасаў 17 вагонаў вапны, але-ж да гэтага часу не адпраўлена ніводнага вагона.

* * *

На 15-е красавіка ў раёне налічваецца 39 калгасаў, якія аб'ядноваюць 13,2 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёну. У сувязі з разгорнутай прапрацоўкай пастаноў VI зьезду саветаў аб калгасным будаўніцтве і растлумачэньнем новага закону аб сельгаспадатку за апошнія дні калектывізацыя гаспадарак узрасла на 3 процанты.

На сённішні дзень землеадвод і землеўказваньне зроблена у 34 калгасах, у двух старых калгасах прырэзваецца зямля ў сувязі з прылівам новых калгаснікаў.

* * *

Зусім нездавальняюча праводзіцца спэцыялізацыя калгасаў у галінах сьвінагадоўлі і малочнае гаспадркі. У двух сьвінагадоўчых калгасах, замест патрэбных 350 матак, пастаўлена... 12, у 9 арганізаваных малочных фэрмах за мест 1.760 галоў малочнае жывёлы пастаўлена 450.

* * *

Гаркалгасаюз, і гаркаапсаюз не забясьпечылі правядзеньня належным чынам галоўнейшых мерапрыемстваў падрыхтоўкі да веснавой сяўбы ні да аднаго кантрольнага тэрміну. Кіраўніцтва гэтых дзьвух арганізацый слаба змагалася за баявую падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны, папартуністычнаму ўскладаючы свае надзеі на самацёк. Па індывідуальным сэктары справа абстаіць асабліва дрэнна. Але-ж гарза не ажыцьцяўляе цьвёрдага кіраўніцтва сельсаветамі ў галіне калектывізацыі і вясновай сяўбы.

Вызначаўшыся ў раёне зрух у галіне калектывізацыі павінен быць неадкладна замацаваны і пашыраны. Гарза, калгасаюз і каапсаюз пад кіраўніцтвам партарганізацыі пры мабілізацыі шырокіх мас калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства, пры дапамозе рабочых гораду павінны забясьпечыць завяршэньне падрыхтоўкі да вясновай сяўбы ў калгасах і індывідуальным сэктары да пачатку вясновай сяўбы.

Перавод ва ўсіх калгасах асноўных сельска-гаспадарчых работ на зьдзельшчыну, ударныя бальшавіцкія тэмпы і напружаная работа забясьпечаць магчымасьць навярстаць упушчанае.

Міх. Р.

Апартуністычна разважаньні, стаўка на самацёк—зрывае ўвядзеньне зьдзельшчыны ў Сьмілавіцкім р.

Калгасы Дукорскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну, яшчэ да сучаснага моманту зусім не займаюцца пытаньнямі зьдзельшчыны. Пераход калгасаў на зьдзельшчыну ня старшынь, ажыцьцявіць рэальныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі дасканалую пастаноўку падліку ходу выкананьня цьвёрдых заданьняў з тым, каб да 25 красавіка ўсе весткі аб давядзеньні цьвёрдых заданьняў па ўсіх відах загатовак былі дасланы Народнаму Камісарыяту Снабжэньня.

Наркамснабу ўстанавіць спэцыяльны нагляд за выкананьнем гэтае пастановы.

3. Прапанаваць Пракурору Рэспублікі тав. Ляўкову: а) на працягу 5-ці дзён прыцягнуць да адказнасьці тых працаўнікоў, якія парушылі дырэктывы СНК аб дачы цьвёрдых заданьняў; б) у выпадку не падачы Наркамснабу да 25 красавіка памянёных у арт. 2 вестак прыцягнуць да адказнасьці і раённых інспэктароў снабжэньня.

4. Прапанаваць Народнаму Камісару яту Снабжэньня, пад адказнасьць тав. Балціна, неадкладна ажыцьцявіць шэраг мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва Наркамснабу работаю раёнаў па загатоўках.

5. Прапанаваць Белкаапсаюзу пад адказнасьць т. Хаскіна, Беллёнакананпляводсаюзу пад адказнасьць тав. Лаціса, Белмалжывёлсаюзу пад адказнасьць т. Жаромскага і Белсадгародсаюзу пад адказнасьць т. Панамарова, на працягу 5-ці дзён ужыць канкрэтныя захады да забясьпечаньня ўдзелу ўсяе сыстэмы загатоўчых органаў на раёне ў справе давядзеньня цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак, іх спагнаньня і арганізацыі падліку загатовак ад кулацка-заможных гаспадарак.

Старшыня Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
М. Галадзед.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
Я. Элькін.

15 красавіка, 1931 г.
г. Менск.

КОМСАМОЛ У АВАНГАРД БАРАЦЬБЫ

за выкананьне плянаў загатоўкі і вывазкі бульбы пралетарскім цэнтрам!

Адгружана толькі 1,4 проц. насеннай бульбы—так „спаборнічаюць" загатоўчыя арганізацыі БССР з Заходняй вобласьцю

РАШУЧА ПЕРАЙСЬЦІ З РАБСКІХ НА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ

Адкрыты ліст

Сакратару ЦК ЛКСМБ тав. Палякову

Дарагі таварыш!

У мінулую восьмі, калі партыя, улада і ўся рабочая грамадзкасьць змагалася за 100-процантнае выкананьне пляну вывазу бульбы для забясьпечаньня Ленінграду, Масквы і іншых пралетарскіх цэнтраў Саюзу, камсамол Беларусі прыняў актыўны ўдзел у дапамозе правядзеньню гэтай вялізарнай работы і на справе даказаў сваю здольнасьць працаваць паўдарнаму на адным з надзвычайна важных гаспадарча-палітычных вучастках.

Мы канстатуем, што ў мінулую восень камсамол Беларусі, арганізацыяй чырвоных эшалёнаў для пралетарыяту Масквы спрыяў наданьню гэтай справе адпаведных тэмпаў і ўкараненьню ў гэтую справу стымулаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Гэтым, у некаторай меры тлумачыцца той факт, што БССР цалкам выканала ў мінулую восень свой абавязак перад пралетарскімі цэнтрамі Саюзу і вывез вызначаную плянам колькасьць бульбы поўнасьцю.

Зараз калі БССР павінна вывезьці за межы БССР 61,000 тон бульбы, калі з боку загатоўчых арганізацый некаторых раёнаў назіраецца злачынная недаацэнка важнасьці гэтай кампаніі, мы лічым, што камсамол, калі ён і ў гэту весну, як у мінулую восень сваімі сіламі, сваім энтузіязмам дапаможа партыі і ўладзе ўдарыць па ўсіх недахопах у загатоўчай рабоце і па ўсіх канкрэтных носьбітах апартуністычных настроеў, дык гэтым самым унясе ў работу адпаведнае здаровленьне.

Просім вас, тав. Палякоў, паставіць на бюро ЦК ЛКСМБ пытаньне аб уключэньні камсамолу ў выкананьне баявога заданьня партыі і ўраду па загатоўцы і адгрузцы бульбы пралетарскім цэнтрам Саюзу.

З камуністычным прывітаньнем
рабкораўскі пост газ. «Сав. Бел.»
Прэабражэнскі, Аксенчык.

19-га красавіка.

Зводка адгрузкі бульбы

Паводле вестак Белсадгароднінны, на сённай бульбы для Украіны адгружана Белкаапсаюзам 32 тоны, Ленінградзкай-на вобласьці Балкаапсаюзам—28 тон і Беллёнасаюзам—30 тон, а разам за дзень—90 тон.

Выкананьне пляну адгрузкі насеннай бульбы за ўвесь час складае 1,4 проц. пляну.

За гэты-ж дзень адгружана Белкаапсаюзам 33 тоны сталовай бульбы. Гэтай колькасьці адгрузкі раёны зрываюць сваячасовае выкананьне пляну бульбазагатован.

Мы паўторна пытаем Белкаапсаюз і Беллёнасаюз, што зроблена імі канкрэтнага для таго каб пераключыць работу п аадгрузцы бульбы на ўдарныя тэмпы, каб забясьпечыць выкананьне пляну ў тэрмін?

Адказвайце!

Аб чым думаюць уваравіцы?

Уваравіцкі Райвыканком стварыў камісію пры райснабе па пытаньні ці варта вывозіць бульбу пралетарскім цэнтрам, а калі варта, дык у якую чаргу.

Іноць, Уваравіцкі Райснаб (подпіс неразборчывы) вынес наступную пастанову: у першую чаргу забясьпечыць бульбаю прамысловасьць, у другую ад кормачныя пункты калгасаў, у трэцюю—адкормачныя пункты вытворчых таварыстваў, і нарэшце вывяз, прычым аб вывазе сказана наступнае: **Поруч з застаўленьнем бульбы на вызначаныя патрэбы, прапанаваць загатоўчым арганізацыям адгружаць бульбу па дасланых нарадах на рабочае забясьпечэньне пралетарскіх цэнтраў СССР».**

Мы раім Наркамснабу ў першым пунцце свайго загаду ад 21-га красавіка зьняць з працы Уваравіцкі райснаб, які ня здолен зразумець палітычні партыі і праводзіць яе ў жыцьцё.

Ударны пост газ. Сав. Бел.»
Прэабражэнскі, Аксенчык і Генін.

Рашуча націснуць на кулака

Пару фактаў наконт таго, як некаторыя раёны на справе падыходзяць да ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі ў змаганьні з кулаком і ліквідацыі яго, як клясы.

У Магілёўскім раёне да гэтага часу цьвёрдыя заданьні па бульбе кулацкімі гаспадаркамі выкананы толькі на 60 проц. Па цэлым радзе сельсаветаў Быхаўскага раёну—Баркалобаўскім, Кузькавіцкім і г. д. ніводнага кулака «ня знойдзеце». Апартуністы з Кузькавіцкага сельсавету, увесь склад якога ў свой час быў зьняты з работы, сьвядома патуралі кулаку і яго агентам.

Што зрабілі раённыя органы, каб сваячасова ліквідаваць гэтыя памылкі і знайсьці кулака, які на некаторы час здолеў ухіліцца ад ападткаваньня? Мабыць нічога.

Трэба адзначыць, поруч з гэтымі фактамі, што ў некаторых мясцох справа са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў па бульбе з кулацка-заможных гаспадарак абстаіць ня лепш.

Мы сыгналізуем аб гэтай небясьпецы, якая стварылася ў некаторых раёнах, і лічым неабходным завастрыць увагу ўсіх раённых арганізацый, папершае, на неабходнасьці 100 проц. безадкладнага спагнаньня бульбы з кулакоў у парадку цьвёрдых заданьняў, і, па-другое на даабкладаньні тых кулакоў і заможнікаў, якія да гэтага часу заданьняў не атрымалі.

Прэабражэнскі, Аксенчык.

Пералому няма—пералом павінен быць!

У адгрузцы насеннай бульбы для Украіны і Ленінградзкай вобласьці пералому яшчэ няма. Па зьвестках на 19-га красавіка адгружана 73,3 тоны.

Для выкананьня заданьня поўнасьцю і ў тэрмін па выкліку загатоўчых арганізацый Заходняй вобласьці і калектыву Белсадгароднінны парт'ячэйка і мясцком Беллёнасаюзу, Белсадсаюзу і Белжывёласаюзу прынялі наступныя мерапрыемствы: праведзен адкрыты сход парт'ячэйкі і агульны сход супрацоўнікаў калектыву, дзе абгаворана пытаньне аб ходзе бульбазагатовак. Сход пастанавіў накіраваць старшыням і ўсім супрацоўнікам райкаапсаюзаў і старшыням РВК ліст аб мабілізацыі ўсіх супрацоўнікаў райкаапсаюзаў на ўдарнае правядзеньне бульбазагатовак, а таксама мабілізаваць усе сілы раёну пры дапамозе партыйных і камсамольскіх арганізацый, стварыўшы ўдарныя тройкі па загатоўцы і адгрузцы бульбы.

З калектыву Беллёнасаюзу і Белсад саюзу, акрамя раней камандзіраваных таварышоў, выяжджае 5 чалавек, якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі, у Рэчыцкі, Нараўлянскі, Капаткевіцкі, Церахаўскі і Азарыцкі раёны для дапамогі райкаапсаюзам па заатоўцы і адгрузкі бульбы.

Пост-брыгада газэты «Савецкая Беларусь»: Сілін, Фіялаў.

За невыкананьне дырэктыў па бульбазагатоўках да адказнасьці

19-га красавіка за подпісам дырэктара Белсадгароднінны тав. Цофіна накіравана Наркому Снабжэньня БССР тав. Балціну гэткая адносіна аб прыцягненьні да адказнасьці старшынь РВК і райспажыўсаюзаў за невыкананьне дырэктывы ЦК і СНК па бульбазагатоўках:

«Ня гледзячы на дырэктывы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, некаторыя раёны, у якіх знаходзіцца значная колькасьць бульбы, да гэтага часу па нарадах Белсадгароднінны не адгрузілі для пралетарскіх цэнтраў ніводнага кілё бульбы.

Прымаючы вад увагу тое, што гэтыя раёны сваёй злачынай бязьдзейнасьцю сьвядома ня выконваюць дырэктыў ЦК і СНК і гэтым самым ставяць пад пагрозу зрыву вываз бульбы, просім вас накіраваць справу пра курору Рэспублікі для

Узяць перакоп тэхнічных ведаў!

Інжынэры, тэхнікі БССР, дапамагайце ўдарнікам, вынаходцам, малодшаму тэхнічнаму пэрсаналу ўзброіцца тэхнічнымі ведамі

Мабілізуем рабочую ініцыятыву на падвышэньне якасных паказьнікаў у выкананьні прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі

На штурм тэхнічных вышынь

Да ўсіх інжынэраў і тэхнікаў

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі, завяршае пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі СССР, вядучы гераічную барацьбу за ажыцьцяўленьне лёзунгу «5-цігодка ў 4 гады», з вялікім посьпехам наступаючы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, выкарчоўваючы рэшткі карэньняў капіталізму.

Клясавы вораг упарта супраціўляецца і вядзе шалёную барацьбу за зрыў сацыялістычнага будаўніцтва. Паласа шкодніцтва, пачынаючы ад шахцінскай справы канчаючы справай контр рэвалюцыйнай «Прампартыі» і «Саюзнага Бюро меншавікоў», зьяўляючыся адной з форм клясавай барацьбы, яскрава паказала, што асобная частка інжынэрства арганічна зьвязаная ў мінулым з капіталістычным строем, імкнулася сарваць сацыялістычнае будаўніцтва, скарыстоўваючы для сваёй шкодніцкай дзейнасьці давер'е рабочае клясы, партыі і савецкай улады, пралезала на кіруючыя пасады ў савецкія, гаспадарчыя і праф. арганізацыі.

На тэрыторыі БССР агідная зграя здрадніка́ў і шкоднікаў «Каплан і К°» і контр-рэвалюцыйныя арганізацыі меншавікоў і нац-дэмакратаў пралазілі ў інжынэрна-тэхнічныя праф. арганізацыі і сав. установы і рабіла сваю шкодніцкую справу. Творчы энтузіязм рабочай клясы ў значнай ступені нэйтралізаваў шкоду, якую прыносілі здрадні́кі.

Тэхнічнае ўзбраеньне ў пэрыяд рэканструкцыі ёсьць клясавая пралетарыяту і яна павінна быць выканана ў самы кароткі тэрмін. Ліквідацыя вашай тэхнічнай адсталасьці для разьвіцця яшчэ больш высокіх бальшавіцкіх тэмпаў будаўніцтва—зьяўляецца галоўнейшай задачай рабочай клясы на сёньняшні дзень.

«Максымум у 10 год мы павінны прабегчы тую адлегласьць, на якую мы адсталі ад перадавых краін--капіталізму». «Тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі рашае ўсё».

Сталін.

Аўладаючы тэхнікай, глыбока ўніка ючы ва ўсе працэсы тэхнічнага кіраўніцтва вытворчасьцю, ліквідуючы тэхнічную нпісьменнасьць—мы выбіваем з рук клясавага ворага, контр-рэволюцыянэра, шкодніка мацнейшую зброю барацьбы з намі. Ад таго, наколькі хутка і поўна мы зможам аўладаць тэхнікай, навучымся ўмела і правільна карыстацца гэтай мацнейшай зброяй у барацьбе за сацыялізм, у значнай меры залежыць хуткасьць і посьпехі нашага сацыялістычнага разьвіцьця.

Зараз па ўсім Саюзе ССР аб'яўлен паход па аўладаньні тэхнікай. Перад усёй масай інжынэраў і тэхнікаў пастаўлена задача безадкладна ўключыцца ў гэты паход, даказаць рабочай клясе на справе сваю адданасьць вялікай справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Інжынэры і тэхнікі БССР, ачышчаючы свае рады ад шкодных і здрадніцкіх элемэнтаў станьце ўсе, як адзін, першымі ў шэрагі барацьбітоў за аўладаньне тэхнікай, аддайце свае тэхнічныя веды рабочым, дапамагайце ім у практычнай рабоце і вучобе на заводах, фабрыках, саўгасах і калгасах.

Інжынэры і тэхнікі, арганізуйце на сваіх прадпрыемствах для шырокіх мас рабочых, малодшага-тэхнічнага пэрсаналу і ў першую чаргу для ўдарнікаў і вынаходцаў, вытворча-тэхнічныя курсы, гурткі, лекцыі, гутаркі і кансультацыі па пытаньням тэхнікі.

Інжынэры і тэхнікі трэстаў і навукова-дасьледчых устаноў! Прымацоўвайце сябе да прадпрыемстваў, цэхоў, ударных брыгад па сваёй спэцыяльнасьці. Дапамагайце лепшай арганізацыі вытворчых працэсаў, хутчэйшаму і поўнаму ахопу тэхнічнай вучобай на прадпрыемствах усёй масы рабочых.

Арганізуйце практычную дапамогу па аўладаньню тэхнікай гаспадарнікам і вылучэнцам В/прадпрыемства.

Перавядзеце працу па аўладаньні тэхнікай на сацыялістычныя, бальшавіцкія мэтады працы праз сац. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Кожны інжынэр і тэхнік павінен стаць грамадзкім працаўніком і актыўна прапаваць па прасоўваньню тэхнічных ведаў ў шырокія масы рабочых.

Арганізуйце абмен вопытам па пытаньні рацыяналізацыі і вынаходзтва з другімі прадпрыемствамі.

Шырока выкарыстоўвайце друк для папулярызацыі сваіх дасягненьняў.

«Перакоп» тэхнікі павінен быць рабочай клясай хутка ўзяты.

Бел. МБІТ упэўнены, што інжынэры і тэхнікі Беларусі з вялікімі посьпехамі выканаюць ускладзеную на нас адказную задачу па аўладаньню тэхнікай і дакажуць усяму сьвету, што шлях савецкага інжынэра і тэхніка—гэта шлях усей рабочай клясы СССР.

За генэральную лінію камуністычнае партыі.

За пабудову сацыялізму.

Інжынэры і тэхнікі, у штурм за аўладаньне тэхнікай.

Прэзыдыум Бел. М. Б. І. Т.

На першым усебеларускім зьезьдзе рацыяналізатараў і вынаходцаў

Старшыня СНК БССР тав. Галадзед вітаючы першы ўсебеларускі зьезд рацыяналізатараў і вынаходцаў ад імя ЦК КП(б)Б і СНК БССР сказаў:

— Пленум ЦК канстатаваў, што невыкананьне прамфінпляну тлумачыцца галоўным чынам тым, што шмат якія арганізацыі ня зусім ясна разумеюць задачы трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Яны спадзяюцца на самацёк, пядбайна адносяцца да выкананьня прамфінпляну.

— Наша рацыяналізацыя адрозьніваецца ад капіталістычнай рацыяналізацыі. Там, у капіталістычных краінах рацыяналізацыя праводзіцца за кошт рабочых, якіх выкідваюць на вуліцу, і на карысьць кішэні капіталістаў. У нас рацыяналізацыя сацыялістычная,—палепшае жыцьцё і быт працоўных мас.

— Барацьба за аўладаньне тэхнікай і тэхнічная рэканструкцыя цесна зьвязаны з рацыяналізацыяй.

— Уся моц нашага сацыялістычнага будаўніцтва ў тым, што ў нетрах пралетарыяту аказалася даволі многа імпэту, энэргіі і думак для палепшаньня нашага будаўніцтва.

— Рацыяналізатары, рабочыя вынаходцы павінны дапамагчы пакончыць з рэшткамі шкодніцтва ў БССР.

— «Ад імя 300 аўтараў вынаходцаў заводу «Бальшавік» вітаю першы зьезд рацыяналізатараў,—кажа тав. Заяц.—Мы датэрмінова выканалі прамфінплян першага кварталу. Мы ўзяліся за аўладаньне тэхнікай. Абяцаем зьезду, што надалей будзем так сама змагацца ў першых радох барацьбітоў за пяцігодку».

* * *

— Вынаходзтва — папяровую кансэрвную каробку аддаю дарэмна на карысьць дзяржаве»,—так заявіў зьезду рабочы вынаходца заводу «Бальшавік» т. Ржэцкі.

* * *

— «Кожны ўдзельнік зьезду павінен унесьці адну рацыяналізатарскую прапанову ў часе зьезду»,—заявіў другі вынаходца.

* * *

І так—адкрыўся першы зьезд рацыяналізатараў і вынаходцаў у БССР. Але гэта першы зьезд ня толькі ў БССР, але і ў СССР. Вось чаму зьезду павінна быць аддана максымум увагі. Вось чаму ўдзельнікі зьезду зьяўляюцца адказнымі за яшчэ большае разгортваньне рабочае дагадкі, за шырокі разгорнуты рух рабочых прапаноў, рабочае вынаходніцтва.

Л. Палеес.

Пустое месца

Работа старога арганізуючага цэнтру—БелМБІТ праходзіла вельмі дрэнна, ганебна адстаючы ад агульных тэмпаў работы.

Яно ня дзіўна, калі ўлічыць тое, што на чале гэтай работы аказаліся ў большасьці сваёй шкоднікі, якія вялі падрыўную работу ў тых установах, дзе яны працавалі.

Знаходжаньне гэтых людзей у прэзыдыуме ў БелМБІТ стварыла правал у работе БелБІМТ.

Зараз абраны новы прэзыдыум БелМБІТ, у які ўвайшлі новыя людзі, у тым ліку член прэзыдыуму ЦСПСВ, ударнік-рабочы (дырэктар заводу) і ўдарнік-спэц (інжынэр Асінбуду).

Здавалася-б, што такі склад прэзыдыуму павінен быў бы забясьпечыць яго працаздольнасьць, крывесьці да ажыцьцяўленьня работу самога МБІТ і яго сэкцый.

Але мы маем, як гаворыцца, пустое месца. За тры месяцы з моманту пера выбараў, прэзыдыум зрабіў паседжань не атэін толькі раз і больш ня зьбіраецца. Вылучаны сакратар кінуты на пасеўную кампанію; тэхнічны сакратар хварэе. Пакой адведзены МБІТу заўсёды знаходзіцца на замку.

Фактычна БелМБІТ, можна сказаць, ня існуе.

Што думае наконт гэтага ЦСПСВ, маючы ў новым, толькі фармальна існуючым, прэзыдыуме МБІТу свайго прадстаўніка,—мы ня ведаем. А што трэба і неабходна думаць аб стварыўшымся становішчы—для нас зусім ясна.

Ня можа таго быць, каб работа БелМБІТ сарвалася з-за таго, што намечаная ў якасьці старшыні асоба (інж. Ігарыёнаў) ня хоча ці ня можа заняць той адказны пост, на які ён вылучаны.

Уявеце сабе, што інж. Ігарыёнаў ня існуе наогул. Няўжо з-за гэтага можа стаць работа цэлай арганізацыі, закліканай кіраваць грамадзкім жыцьцём спэцыялістаў?

Мы думаем, што такога становішча ня можа быць: калі не Ігарыёнаў, дык павінен знайсьціся другі. Прытым, на нашай думцы, націск трэба рабіць не на старшыню МБІТ (як гэта робіць ЦСПСВ), а на адказнага сакратара, які ўласна і павінен весьці работу.

Справа надалей так заставацца ня можа. Зараз перад спэцыялістамі, сумленна выконваючымі даручаную ім рабату, стаяць вялікія задачы па выкананьні агульнага пляну работ пяцігодкі ў чатыры гады, запаўненьні маючыхся прарываў, галоўным чынам, ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, якое яшчэ доўгі тэрмін прыдзецца выжываць.

Гэтыя задачы патрабуюць, каб кіраўніцтва спэцыялістамі на грамадзкай лініі стаяла на выпыні, будучы само досыць актыўным і актывізуючы масу спэцыялістаў.

Кульгін.

РАСЬНЯНСКІЯ АПАРТУНІСТЫ

выконваюць заказ кулакоў--даводзяць цьвёрдае заданьне да серадняцкіх гаспадарак

Бязьлітасна біць па праявах правага апартунізму і „левых" загібах, па права-„левацкай" практыцы. Неадкладна выправіць антысерадняцкія перагібы, рашуча змагацца супроць настрояў самацёку, узмацніць работу сярод бяднаты.

Сыгналы друку не пачуты

Расьнянскае раённае кіраўніцтва пагразла ў балоце апартуністычнай практыкі

Аб скрыўленьні лініі партыі і праявах правага апартунізму ў Расьнянскім раёне ўжо ня раз сыгналізавалася нашым друкам. Аднак, жорсткая бальшавіцкая крытыка іх дзейнасьці, памылак, галавацяпства і перагібаў не найшла ў карысьць расьнянскім «працаўніком», зусім якоравая лінія партыі у загатоўках не знайшла свайго правільнага ажыцьцяўленьня ў Расьнянскім раёне. Замест разгорнутай вялікай масавай работы, разьвіцьця сацспаборніцтва і ўдарніцтва для 100-процэнтнага выкананьня пляну загатовак, расьнянскія кіраўнікі абмежаваліся пісаньнем доўгіх рэзалюцый аб значэньні загатовак і займаліся разважаньнямі аб нерэальнасьці пляну, у выніку чаго ўся работа ішла самацёкам.

Бяднацка-серадняцкія масы вакол загатовак зусім не арганізаваны. Да кулацкіх гаспадарак цьвёрдыя заданьні былі давядзены, але вучоту выкананьня імі цьвёрдых заданьняў ня было. Некаторыя работнікі зусім не «заўважылі» клясавай барацьбы на вёсцы. Усяго па раёне было выяўлена толькі... тры кулацкіх гаспадаркі і толькі зараз выяўлена каля 20.

Таксама абстаюць справы і ў адносінах лесазагатовак. Пры РВК створана тройка, але яна дагэтуль нічога не зрабіла і нават ня ведае як ідуць лесазагатоўкі. Ні райком КП(б)Б ні РВК пытаньнем гэтым не займаліся і толькі зараз, бачачы амаль поўны зрыў лесазагатовак, аб гэтым было пастаўлена пытаньне на прэзыдыуме РВК. Прычым вызначаная тройка нават не зьвялася на гэтае паседжаньне.

Каб выправіць становішча з загатоўкамі ў раёне абвясьцілі «штурм прарываў у загатоўках», але і тут было нароблена шмат перагібаў і памылак, у выніку чаго цьвёрдыя заданьні часта даводзіліся да серадняко́ў і нават беднякоў.

На Доўгавіцкім сельсавеце цьвёрдыя заданьні давалі беднякам і серадняком. Найбольш характарны прыклад—гэта дача цьвёрдых заданьняў па пазыцыі «пяцігодка ў чатыры гады» усім па наступнай сваясаблівай дыфэрэнцыацыі: беднаку—25 руб., серадняку—30 руб., больш моцнаму—50 руб., заможнаку і кулаку—100 руб.

У Рабцаўскім сельсавеце лён таксама разьмяркоўваўся паміж усімі па вучотных картках. А ў Дзедзіеўскім сельсавеце лён разьмеркавалі таксама па картках, прычым маламоцным давалі 8 кгр. мацнейшым—10 кгр. і заможнікам—15 кгр.

Таму невыпадкова, што пасьля нават гэтага «головокружительного» адміністраваньня па галоўных відах загатовак мы на сёняшні дзень маем поўны провал, ня гледзячы на тое, што усе прадпасылкі для выкананьня пляну ў раёне ёсьць.

Возьмем пяньку і пакажам расьнянскім кіраўніком як «нерэальны план» ці як вярней нерэальна іх работа. Паводле даных вучотных картак, якія запісваліся са слоў сялян, яўна зьменшаная плошча пад пасевам пяньки раўняецца 284 га. Паводле статыстычных вестак таго-ж Расьнянскага РВК, адзін га ўраджаю дае ў калгасе 3 цэнтр., а ў аднаасобным сэктары—2 цэнтр. І калі ўлічыць і яшчэ раз зьменшаны сярэдні ўраджай на дзесяціну—3 цэнт.,—дык ураджай пяньки ў раёне складае ня менш 852 цнт., а паводле заданьня трэба загатаваць усяго 300 цэнтр.

Адсюль ясна, што арганізаваўшы бяднацка-серадняцкія масы па здачы нават паловы свайго ўраджаю па пяньцы і прымусіўшы кулацка-заможныя элемэнты аддаць усе свае лішкі, можна было-б ня толькі выканаць але і перавыканаць план «сустрэчным» ня менш як на 160 проц. Прыблізна такое-ж становішча мецца ў адносінах да лёну. У выніку такой работы мы маем выкананьне пляну на сёняшні дзень па пяньцы толькі... на 15 проц., а па лёне—14 проц.

Яшчэ горш абстаіць справа з лесазагатоўкамі. Трэба было высек па пляну 23.100 кубамэтраў, высечана-ж усяго 29 проц. пляну; вывезьці трэба было 31.000 кубамэтраў, а вывезена ўсяго 30 проц., хоць працаздольных коняй на раёне лічыцца 5.497 і на кожнага каня прыпадае каля 7 кубамэтр. Гэтае плянавае заданьне пры добрай арганізаванасьці можна было выканаць чырвонымі абозамі за 1-2 тыдні, а на сёняшні дзень мы маем поўны провал лесазагатовак, сакратар-жа РК тав. Коханаў займаўся «очкаўціратэльствам», заяўляў, што па будматар'яле план будзе выкананы больш на 100 проц.

Ня лепшае становішча з мабілізацыяй сродкаў і спатаваньнем аднаразовага збору. Падрыхтоўка да веснавой пасеўнай кампаніі таксама абстаіць вельмі дрэнна. Плены веснавой кампаніі яшчэ да гэтага часу «ўзгадняюцца» пераапрацоўваюцца ў Райкалгассаюзе і Райзо; да вёскі і да двара ў сваёй большасьці не давядзены. Цьвёрдыя заданьні па сяўбе кулацкім гаспадаркам таксама яшчэ ня дадзены. Яшчэ горш справа з інвэнтаром і ачысткай насеньня.

Побач з патураньнем кулаку, галавацяпскай бязьвдзейнасьцю — некаторыя работнікі нават і сам сакратар РК КП(б) Коханаў і старшыня РВК тав. Воўкаў, каб застрахаваць сябе ад абвінавачэньня у правым апартунізьме, далі «лявацкую» установу, якая прывяла да антысерадняцкіх перагібаў.

Гэта ўсё робіцца ў той час, як у раёне слаба ідзе работа па выяўленьні кулацкіх гаспадарак для індывідуальнага абкладаньня пры абароне іх некаторымі работнікамі і варожым нам элемэнтам у сельсаветах. Напрыклад: у Доўгавіцкім сельсавеце выяўлен рад гаспадарак былых валасных старшынь, судзьдзяў, якія маюць па 12-15 га зямлі, па 2 кані, па 3 каровы, частку якіх яны разбазарылі, цялят палову забілі, ужывалі наёмную работу, маюць малатарні, веялкі, якія здаюць у наём, як, напрыклад, гаспадарка Старамохава Васіля, Паўлючэнкі Нікіфара з вёскі Доўгавічы. Гэтым гаспадаркам нават ня дадзена цьвёрдых заданьняў. У вёсцы Валымер для захаваньня ад індывідуальнага абкладаньня зроблена рад фіктыўных падзелаў кулацкіх гаспадарак, напрыклад, гаспадарка Драчовых падзелена сельсаветам на 3 гаспадаркі, Кібловых Куліна з сынам—на дзьве гаспадаркі, Захаранкі Міколы з сынам—на 2 гаспадаркі і інш., у той час як члены гэтых гаспадарак фактычна вядуць гаспадарку разам і цьвёрдага заданьня ім ня дадзена.

Усё вышэйпаказанае аб работе Расьнянскага кіраўніцтва і становішчы работы ў раёне паказвае, што ранейшыя сыгналы ў друку і неадназоравая бальшавіцкая крытыка цэнтральнага друку не найшлі на карысьць расьнянскім кіраўнікам. Раённае кіраўніцтва ня здолела зрабіць з гэтай крытыкі адпаведных вынікаў і выправіць дапушчаныя перагібы і сваю апартуністычную практыку, а дапусьціла пагдыбленьне гэтых памылак.

Трэба праверыць усю дзейнасьць Расьнянскага кіраўніцтва і прыняць рашучыя захады да яго аздараўленьня.

Ал. Слабодзкі.

Крынкаўская партячэйка—у балоце апартунізму

Безгаспадарчасьць, падзёж жывёлы, заціск самакрытыкі—вось вынікі яе кіраўніцтва

Крынкаўская парт'ячэйка (Высачанскі раён) стаіць у бяку ад выкананьня дырэктыў партыі па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ячэйка знаходзіцца пры племгасе «Крынкі», але зусім не займалася гаспадарчымі пытаньнямі і не кіравала племгасам. Адсутнасьць кіраўніцтва з боку ячэйкі зьяўлецца асноўнай прычынай тых буйных прарываў, якія маюць месца ў гэтай гаспадарцы.

Бесгаспадарчасьць у племгасе мяжуе са шкодніцтвам. З восеми закладзена 5 ям сілосу (300 тон). Былы загадчык племгасу т. Руцько, яка зараз вылучан загадчыкам Высачанскага райземаддзелу, закладаў сілос нядбайна, сілос зусім сапсаваўся кармы захоўваюцца безгаспадарча, псуюцца. Ня гледзячы на недахоп кармоў жывёла корміцца бяз нормы, на вока. У выніку сыстэматычны надёж жывёлы. За апошні час з 1-га студзеня пала цялят 21, кароў больш 5, маладняку звыш 15 шт., прырэзана звыш 40 штук буйнай рагатай жывёлы.

На скотным двары 50 проц. лішня га штату, частка працаўнікоў сыстэматычна п'янствуе. Працдысцыпліны няма. Малочныя прадукты разбазарваюцца. Навакол загадчыка племгасу т. Лёшына маецца сямейсьцьвенасьць (Роцкін, Сёмачкін, Сучкоў і інш.).

Становішча рабочых дрэннае, культурная работа ў загоне, самакрытыка заціснута. Людзей, пачынаючых крытыкаваць апарат, стараліся выжыць з племгасу—факт з жывёлаводам т. Раманюком, які загадчыкам племгасу зьнят з работы без усякіх падстаў.

Кулацкія элемэнты выкарыстоўваюць факты, бесгаспадарчасьці ў сваёй варожай агітацыі супроць арганізацыі сацыялістычных форм сельскай гаспадаркі.

Але кіраўніцтва ячэйкі і племгасу, апынуўшыся ў балоце апартунізму, ня лічыць патрэбным арганізаваць рабочыя і бяднацка-серадняцкія масы на барацьбу з клясавым ворагам, ня прымае ніякіх захадаў для аздараўленьня становішча ў племгасе для ачышчэньня яго ад шкодніцкаў і кулацкіх элемэнтаў.

В. Жураўлёва.

Створым рацыяналізатарскі фонд ІТР імя 1-га мая

Зварот інжынэрна-тэхнічных работнікаў чырвонасьцяжнага заводу „Бальшавік" да ІТС усіх фабрык і заводаў

Адным з магутных фактараў будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне зьяўляецца рацыяналізацыя. СССР налічвае рад вялізарных дасягненьняў на гаспадарчым фронце, дзякуючы творчай думцы рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Сацыялістычная рацыяналізацыя заклікана паскорыць выкананьне важнейшых задач у галіне народнай гаспадаркі, якія стаяць у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Інжынэрна-тэхнічны работнік, уладаючы тэхнікай і ведамі, павінен быць камандзірам ударных калён па ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, у тым ліку на рацыяналізатарскім.

Мы, інжынэрна-тэхнічныя работнікі Менскага Чырвонасьцяжнага гарбарнага заводу «Бальшавік», рашылі на агульным сходзе стварыць «рацыяналізатарскі фонд ІТР імя 1-га мая».

Мы высунулі да самых сябе лёзунг:

«Кожны ІТР павінен унесьці ня менш двух прапаноў у рацыяналізатарскі фонд імя 1-га мая».

Мы зварочваемся да інжынэрна-тэхнічных сэкцый усіх фабрык і заводаў пасьледаваць нашаму прыкладу і стварыць агульна-рэспубліканскі рацыяналізатарскі фонд ІРТ імя 1-га мая.

Старшыня сходу Аксельрод.
Сакратар Бекман.

Камсамольцы „Спартака" абвясьцілі паход за тэхніку

Растлумачальная работа за аўладаньне тэхнікай на ф-цы «Спартак» яшчэ не ахапіла шырокія масы рабочых. Фабком і дырэкцыя фабрыкі ня сталі рашуча за правядзеньне ў жыцьцё прамовы тав. Сталіна. Першым застрэльшчыкам для ажыцьцяўленьня прамовы т. Сталіна зьявіўся камсамольскі актыў фабрыкі «Спартак», які абвясьціў паход за навуку і тэхніку.

Камсамольскі калектыў бярэ на сябе наступныя абавязкі: Давесьці прамову тав. Сталіна, пастанову ЦК УсеКСМ і бюро калектыву аб арганізацыі паходу за тэхніку да кожнага камсамольца, ударніка, дарослага рабочага, абгаварыць на ўсіх сходах ячэек КСМ, на цэхавых агульных сходах і ў школах ФЗС і ФЗУ і піянэатрах.

Правесьці сходы маладых ударнікаў па цэхах па пытаньні канкрэтных мерапрыемстваў арганізацыі паходу за навуку і тэхніку, як лепшага сродку выкананьня якасных і колькасных паказьнікаў прамфінпляну. Камсамольскі актыў ячэйкі павінен прыцягваць ма ючыяся ў цэху інжынэрна-тэхнічныя сілы, майстроў, практыкантаў, якія павінны быць першымі памочнікамі камсамольскіх ячэек у барацьбе за аўладаньне тэхнікай. Вывучыць прамфінплян фабрыкі, з якіх аб'ектаў ён складаецца, як складаюцца выпворчыя нарады для варштатаў. Удзельнічаць у тэхнічных абгрунтаваньнях пляна ў і ў кантролі над іх выкананьнем. Давесьці ці плян кварталу, месяца, дэкады да кожнага брыгадзіра.

На якасьці прадукцыі вывучыць тэх налёгічныя прычыны браку і стварыць спэцыяльныя брыгады ўзорнай прадукцыі з камсамольцаў і моладзі. Лічыць мэтазгодным вылучыць 3 дні ў месяц для тэхнічнае вучобы, каб набыць мінімум тэхведаў. Пры клюбе арганізаваць куток тэхнікі і электрафікацыі, які павінен распачаць работу з 20 красавіка.

Вось тыя мерапрыемствы, якія мяркуецца правесьці бюро калектыву КСМ сумесна з актывам камсамольцаў інжынэрна-тэхнічным складам і рабочымі. Гэтыя мерапрыемствы будуць выкананы тады, калі як дырэкцыя, так і фабком павернецца тварам да аўладаньня тэхнікай.

Гіш.

Курсанты прадстаўлены самім сабе

Брыгадай па праверцы апарату ЦІП было праведзена два палёты на інтэрнат курсантаў ЦІП з мэтай высьвятленьня, як жывуць курсанты і якая культурна-выхаваўчая работа праводзіцца сярод іх.

Выяўлена, што ніякай культурна-выхаваўчае работы сярод курсантаў ня вядзецца.

Няма ні газэт, ні бібліятэчак у інтэрнаце і, наогул, нічога няма, што магло-б даць курсанту культурны адпачынак.

Больш таго, курсанты прадстаўлены самім сабе. Вось чаму ў інтэрнаце, які зьяўляецца каля Менскаго, курсанты пьюць гарэлку, граюць у карты на тропы і г. д.

Кіраўнікі ЦІП, а таксама і інструктары, у інтэрнаце ніколі ня былі і ня бываюць.

Брыгада лічыць, што гэты факт зьяўляецца нецярпімым і яго трэба зараз-жа выкарчаваць і арганізаваць ад паведную культурна-выхаваўчую работу ў далейшым, а па вінаватых трэба ўдарыць, так, каб гэта было ўрокам і для іншых.

Брыгадзір Санольчын.

Магутнай хваляй пратэсту і абурэньня

адказваюць пралетарыят і працоўныя масы БССР на шалёную падрыхтоўку польскіх імпэрыялістаў інтэрвэнцыі супроць СССР на разгул фашысцкага тэрору на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне

Прэч фашысцкіх забойцаў!

Заслухаўшы інфармацыю аб шалёным тэроры на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, пашыраны міжсаюзны сход Ельскага раёну далучае свой голас пратэсту да мільёнаў працоўных усяго сьвету супроць нячуванага разгулу фашысцкага тэрору ў Польшчы, на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

Разгулам бізуна і шыбеніц, разгромамі культурна-нацыянальных установ на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, польскія імпэрыялісты імкнуцца стварыць спакойны тыл для ўзброенага нападу на Савецкі Саюз. Верныя лёкаі польскіх мілітарыстаў—беларускія нацыянал-фашысты, натхніцелі контррэвалюцыйнай банды беларускіх нацдэмаў, зьяўляюцца непасрэднымі праваднікамі імпэрыялістычнай палітыкі польскага фашызму на Заходняй Беларусі.

Разгром беларускага работніцка-сялянскага клюбу «Змаганьне», ліквідацыя ўсіх беларускіх культасьветных устаноў, праванацыйныя арышты, забойствы лепшых правадыроў рэвалюцыйнага руху, серадняявяковыя катаваньні ў фашысцкіх засьценках дыфэнзывы—вось малюнак панаваньня польскага фашызму на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

На крывавы тэрор на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне міжсаюзны сход Ельскага раёну адказвае яшчэ цясьнейшай згуртаванасьцю вакол партыі і яе ЦК, патраеньнем тэмпаў барацьбы за сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі—калектывізацыю і выкананьне пяцігадовага пляну.

Няхай жыве КП(б)Б, правадыр сацыялістычнага будаўніцтва БССР!

Няхай жыве камуністычная партыя Заходняй Беларусі!

Прэч фашысцкіх забойцаў!

* * *

Канфэрэнцыя пераменьнікаў Сьміла віцкага раёну з абурэньнем пратэстуе супроць белага тэрору фашысцкіх катаў на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

Канфэрэнцыя пераменьнікаў у адказ на тэрор фашысцкіх акупантаў па станаўляе пакласьці ўсе сілы для правядзеньня па-ўдарнаму другой бальшавіцкай вясны. Канфэрэнцыя заклікае пераменьнікаў пашырыць калгасныя рады шляхам масавага уступленьня ў калгасы.

Няхай жыве рэвалюцыйны рух на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне!

Няхай жыве сусьветны Кастрычнік!

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

У сувязі з надыходзячымі першамайскімі выступленьнямі пралетарыяту, у Польшчы пачалася ўжо, па прыкладзе мінулых год паліцэйская «падрыхтоўка», у выглядзе масавага абучэньня паліцы, фашысцкіх і пэпэсэўскіх атрадаў «мастацтву разганяць дэманстрантаў». (З газэт).



„ПАДРЫХТОЎКА" ДА 1 МАЯ

Канфлікт паміж Польшчай і Данцыгам

ВАРШАВА. 17-IV. Шум ўзьняты вакол польска-данцыгскага канфлікту не заціхае. Асабліва рэзка выступае сёньня орган вайсковага міністэрства «Польска Збройва». Газэта папракае Лігу Нацый, што ў выніку яе незразумелай мяккасьці і патураньня, данцыгская ўлада да таго зрабілася нахабнай, што праваканаваньне Польшчы ператварылася ў іх мэтад. «Ва ўсім сьвеце,—піша газэта,—калі ня лічыць Цэнтральнай Афрыкі або якой-небудзь камунізаванай правінцыі Кітаю, няма таго месца, дзе-б элемэнтарныя правы польскіх грамадзян, іх маемасьць і жыцьцё былі натолькі мала абаронены, як у Данцыгу. У заключэньне афіцыёз піша: «Час канчаць. Польшча лагодная і цярпялівая, але яе цярпеньне ў адносінах Данцыгу вычарпана да канца. Ліга Нацый ня можа і не павінна адмовіцца ад умяшаньня ў гэты канфлікт таму, што Польшча ня сьцерпіць новай праваканыі».

На канфлікт рэагуе таксама так званы «апазыцыйны» друк. «Газэта Варшаўска» энэргічна заяўляе, што «калі бэрлінскі ўплыў паставіць у парадак дня данцыгскае пытаньне, дык Польшча павінна будзе падумаць аб яго радыкальным вырашэньні».

Ня менш пэўную пазыцыю займаюць і польскія сацыял-фашысты. «Работнік». заяўляе, што «паводзіны данцыгскай улады задзяюць ня толькі Польшчу, але і Лігу Нацый» і выказвае упэўненасьць, што «вярхоўны камісар ужыве і ўсе сродкі для абароны правоў і прэстыжу Польшчы». Кажучы пра абарону польскай меншасьці ў Данцыгу, «Работнік» становіцца на «вялікадзяржаўны» пункт погляду.

«Польшча,—піша газэта,—мае ў адносінах Данцыгу зусім іншыя і да таго-ж большыя правы, чым Нямеччына ў адносінах нямецкай меншасьці Польшчы».

Рэвалюцыйная барацьба працоўных сялян з польскім фашызмам узмацняецца

ВАРШАВА. 15-IV. У Пазнанскім ваяводзтве ў маёнтку Рыдлёў батракі патрабавалі ад памешчыка выдачы аплату, які належыць ім згодна ўмовы і які не выдаваўся на працягу месяца.

Памешчык запершыся ў сябе дома, пачаў страляніну ў батракоў. Азлобленыя батракі зламалі дзьверы і ўварваліся ў дом памешчыка. На другі дзень батрака былі арыштаваны паліцыяй.

ВАРШАВА. 19-IV. Лёзунг кампартыі Польшчы: «Ні гроша падатку фашысцкай дыктатуры» атрымлівае ўсё большае распаўсюджаньне сярод прыгнутых падаткам сялян.

У вёсцы Міхалкі (Бела-Падляскі павет) сялянне пратэлі судовага выканаўцу разам з паліцыяй, якія жадалі адабраць жывёлу і інвэнтар у сялян за падаткі.

Зьезд чырвоных фабзаўкомаў

БЭРЛІН. 14. У Абэргаўзэне (Рур) адбыўся зьезд чырвоных фабзаўкомаў мэталюргічнай і горнай прамысловасьці Рурскай вобласьці.

У зьезьдзе ўдзельнічала звыш 300 дэлегатаў. Дэлегаты абавязаліся правесьці на сваіх прадпрыемствах падрыхтоўку да ўсеагульнай забастоўкі, арганізаваць збор сродкаў у стачачны фонд і стварыць камітэты ўпаўнаважаных на ўсіх капальнях і прадпрыемствах.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Мэталёвы лом--мартэнам

Спажывецкая каапэрацыя Буда-Кашалёўскага раёну адказваецца прымаць мэталялом, сабраны комсамольцамі і піянэрамі. Сабраны лом бяз руху валяецца пад сьнегам. Рашуча зламаць перашкоды на шляху збору мэталялому.

Каляровы мэталь ёсьць— ён павінен быць сабраны

Востры дэфіцыт у каляровых мэталях можа быць у значнай ступені ліквідаваны, калі мы сёньня-ж адмовімся ад непатрэбнай роскашы, здаць краіне ўвесь каляровы мэталь, які маецца ў кожнага з нас у выглядзе ручак, трамвайных шпінгалетаў, кутнікаў, ручак ад сталоў і г. д.

Камсамолу, піянэрам і школьнікам неабходна правесьці шырокую паквартальную зборку каляровых мэталяў не затрымліваючы здачай аддзяленьням трэсту «Мэталёлом». Кожны камсамолец, піянэр і школьнік, павінен мець цьвёрдае кантрольнае заданьне па зборы каляровага лому.

ВСНГ БССР павінен павесьці шырокую растлумачальную работу сярод рабочых прадпрыемстваў і ўстаноў і павесьці кампанію за здачу імі ўсіх непатрэбных рэчаў з каляровага мэталю.

К.

Здаць мэталялом

У той час як наша краіна адчувае вялікую патрэбу ў каляровым мэталі і грамадзкасьць высоўвае розныя мерапрыемствы па зборы каляровага лому, як-то зьняцьця мядзяных ручак з дзьвярэй, трамваяў і г. д. У гэты час ёсьць такія сельсаветы, якія маючы каляровы мэталь не здаюць яго Мэталялому.

Млечанскі сельсавет зьняў адзін звон у 30 пуд. і не аддае яго Мэталялому. У мястэчку Крычаве зьнят адзін звон у 15 пудоў і перададны пажарнай арганізацыі, у той час калі

Суботнік на заводзе «Камунар» па збору мэталялому.

для пажарнай каманды дастаткова было-б звону ў 3 пуды. У Быхаве зьняты з царквей тры званы, а здаваць яны іх ня зьбіраюцца. Калі зьявіўся агент Мэталялому, дык некаторыя сельсаветы адказвалі, што хутка будуць здымаць астатнія званы з іншых царквей тады ўсё разам будуць зданы. Неабходна прыняць адпаведныя меры да тых сельсаветаў, якія ня выконваюць дырэктыў партыі і ўраду аб зборы мэталялому.

Галінец.

Пачаліся работы па разборцы помніка

Пачаліся работы па разборы помніка двю вызваленьня Полацку ад французаў. Помнік ня мае асаблівага гістарычнага значэньня, а тым часам дагэтуль дарэмна прападала шмат чугуну, з якога пабудаваны помнік.

Разбор помніка дасьць мэталюргічным заводам звыш 14 тысяч кілё чугуну. Работы праводзяцца ва ўдарным парадку.

Белкаапсаюз зрывае забясьпечаньне мартэнаў мэталяломам

Белкаапсаюз, зьяўляючыся контрагентам трэсту «Мэталялом» па загатоўцы лому чорных і каляровых мэталяў, праз сваю нізавую каапэрацыйную сетку не аддае належнай увагі гэтай сур'ёзнай гаспадарча-палітычнай задачы, у выніку чаго ў студзені

Рабочы заводу «Камунар» падбірае мэталялом.

плян па зборы чорных мэталяў выкананы на 5,8 проц., па лому каляровых мэталяў на 64 проц.

Даяжуючы нядбайным адносінам да надзвычайна важнай справы, заводы мэталюргічнай прамысловасьці маюць перабоі ў забясьпечаньні асноўнай сыравінай—мэталяломам.

Белкаапсаюзу неабходна зараз-жа перабудаваць сваю работу так, каб ахапіць усю работу па загатоўцы мэталялому, каб ніводзін кавалачак лому не застаўся непрымечаным.

Белкаапсаюзу неабходна папулярызаваць работу па зборы мэталялому, вылучыць грамадзкіх зборшчыкаў з каапактыву, вылучыць адказнага працаўніка праўленьня для спэцыяльнага кіраўніцтва вучасткам гэтай работы, увязаць усю сваю работу з шырокай грамадзкасьцю.

К.

Прымаюць актыўны удзел у зборы мэталялому

Наша Старасельская школа сямігодка прыняла актыўны ўдзел у зборы мэталялому і ўтыльсыравіны. Былі арганізаваны ўдарныя брыгады па зборы мэталялому; вынікі аказаліся наступныя: жалеза сабралі 300 кгр., таксама сабрана паперы 60 к.

Арэшкаў.

Загатоўка мэталялому іх не датычыцца

Камсамольская арганізацыя Буда-Кашалёўскага раёну ўзьняла пытаньне аб зборы мэталялому. Камсамольцы і піянэры сабралі лом і калі прышлося яго здаваць, дык каапэрацыя Буда-Кашалёўскага раёну адказвае: «На вошта нам гэтым барахлом займацца. Мы гэтага «барахла» прымаць ня будзем». Такім чынам той мэталялом, які сабралі камсамольцы і піянэры, зараз ляжыць у кучы пад сьнегам бяз ўсялякага скарыстаньня.

Бюро РК ЛКСМБ адзначыла, што гэта недапушчальнае галавацяпства з боку каапэрацыі і прасіць прыняць адпаведныя меры да такіх галавацяпскіх адносін да зборкі мэталялому з боку праўленьня каапэрацыі і крам Буда-Кашалёўскага раёну.

Бойчанка.

Спажывецкая каапэрацыя Копылю зрывае пляны збору мэталялому

Калі наша краіна адчувае патрэбу ў мэталі, у гэты час ёсьць такія раёны, якія гэтага ня хочуць зразумець і да гэтага часу ўсё працягваюць затрымліваць здачу мэталялому.

Вось факт. Спажывецкая каапэрацыя, Капыльскага раёну, атрымала плян на асобны квартал па зборы мэталялому ў 100 цэнтн. чорнага мэталю і 10 цэнтн. каляровага, з якіх імі выканана за асобны квартал па зборы мэталялому ўсяго 2 цэнтн.

На першы квартал 1931 г. паводле пляну, ім дана заданьне сабраць 600 цэнтн. і ліквідаваць прарыў у 118 цэнтн. асобнага кварталу. Між тым, да 28 лютага імі сабрана мэталялому толькі 9 цэнтн.

Ня лепш абстаіць справа і з іншымі відамі загатовак.

Усё гэта справа з выкананьнем пляну была перададзена пракурору і 27 лютага нарсуд Копыльскага раёну, разглядзеўшы гэтую справу, вінаватымі ў зрыве плянавых загатовак даў па заслугах.

Астатнім раёнам ня трэба браць прыкладу ад Капыльскай спажывецкай каапэрацыі, а сапраўднымі бальшавіцкімі тэмпамі перабудаваць сваю работу, па-баявому ўзяцца за выкананьне пляну па зборы мэталялому і ўсіх відаў загатовак.

Галінец.

Пастанова Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

па справе старшыні Копыскага РВК тав. Сьцепанюка

Заслухаўшы вынікі расьсьледваньня членам ЦКК КП(б)Б тав. Скробут і пастанову Копыскага РК і РКК, рад матар'ялаў і заяў аб груба-бюракратычных паводзінах члена КП(б)Б—старшыні РВК т. Сьцепанюка—Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б адзначае:

1. Лічыць упаўне падцьведзіўшымся за т. Сьцепанюком рад зусім недапушчальных для члена партыі і адказнага працаўніка груба-бюракратычных і антыпартыйных паводзін, як:

а) вычыньне рабочых з свайго кабінэту, ігнараваньне рабочых вылучэнцаў т. т. Хамякова, Грыдзюшка, даходзячае да абзываньня апошняга «сапляком», выгнаўшы іх з кабінэту;

б) кіданьне службовых дакумантаў, якія былі прадстаўлены яму на зацьверджаньне тэхнікам т. Сьцепанцовым, і кінуў паперамі ў вылучэнца Хамякова, які зьвярнуўся да яго за растлумачэньнем па службовых справах;

в) фармальна-бюракратычныя адносіны да супрацоўнікаў раёну і зат. адзелаў РВК, што выклікала масавую падачу заяў аб уходзе з работы;

г) рад іншых фактаў бюракратычных адносін да наведвальнікаў.

2. Адзначыць, што з боку т. Сьцепанюка былі праяўлены яўна антыпартыйныя паводзіны ў адносінах да РКК-РСІ, даходзячыя да простага задіраньня і ігнараваньня РКК, нават адмаўленьня зьявіцца па выкліку на паседжаньне РКК, дзе разглядалася яго справа, камандваньне над РСІ (заявы «РСІ мой пададзел», «я не ў бараньні рог сагну» і інш.), агідныя факты кампрамэтацыі асобіста старшыні РКК, як напроза на пашыраным паседжаньні прэзыдыуму РВК аб выстаўленьні апошняга з паседжаньня і інш. факты непартыйных адносін да РКК-РСІ.

3. Прэзыдыум ЦКК канстатуе, што гэтыя агідныя факты бюракратызму і яўна антыпартыйных паводзін, дапушчаныя Сьцепанюком сьведчаць аб тым, што ён, ня гледзячы на рад разьяньняў партыйных органаў па абвінавачаньні яго ў бюракратызьме і інш. некамуністычных учынках, як: а) атры маў у 1925 г. партопагнаньне ад Казакстанскай КК за трубасьць і нетактычнасьць, б) у 1929 г. атрымаў суровую вымову ад парткалегіі ЦКК КП(б)Б за груба-бюракратычныя паводзіны, заносьлівасьць і нават злоўжываньне службовым становішчам, звальненьне з работы асоб, крытыкуючых яго,—т. Сьцепанюк ня толькі ня справаўся, а працягваў груба-бюракратычныя і непартыйныя паводзіны.

За кароткі тэрмін знаходжаньня т. Сьцепанюка на рабоце ў Копысі,—ён сваімі паводзінамі і праступкамі кампрамэтаваў РВК.

Выходзячы з гэтага, Прэзыдыум ЦКК пастанаўляе:

4. Згадзіцца з рашэньнем Прэзыдыуму Копыскай РК КП(б)Б па гэтай справе; тав. Сьцепанюку за дапушчэньне ў сваёй рабоце груба-бюракратычных, непартыйных паводзін, ігнараваньне РКК-РСІ—абвесьціць суровую вымову з папярэджаньнем і зьняць з работы старшыні Копыскага РВК з забаронай на 2 гады займаць адказныя пасады.

5. Абвясьціць справу і гэтую пастанову ў друку.

Нам. старшыні ЦКК КП(б)Б Рыскін.

ЗАКОНЫ І ПАСТАНОВЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ХОД ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЎВЯДЗЕНЬНЯ НОВАЙ СЫСТЭМЫ КРЭДЫТАВАНЬНЯ

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што:

а) падрыхтоўка да правядзеньня зьмен у сыстэму крэдытаваньня гаспадарчымі арганізацыямі і аб'яднаньнямі (прамысловасьць, сельская гаспадарка, каапэрацыя) праводзіцца недапушчальна марудныемі тэмпамі.

Многія гаспадарнікі зусім не ўявілі сабе ўсяе важнасьці гэтай падрыхтоўкі.

Апарат Дзяржбанку (асабліва яго філіялы) не ўявіў усяе важнасьці гэтай работы і яшчэ ня ўжыў належных канкрэтных захадаў да яе правядзеньня;

б) дагаворная кампанія яшчэ не разгорнута і гаспадарчыя арганізацыі пакуль-што абмяжоўваюцца толькі заключэньнем генэральных дагавораў;

в) ужываньне гаспадарчага разьліку ва ўсіх зьвяньнях гаспадаркі і адпаведных гаспадарчых устаноў да гэтага часу ня выходзіць яшчэ за межы агульных разважаньняў і не атрымала яшчэ канкрэтнага прыстасаваньня на прадпрыемствах.

Адзначаючы памянёнае вышэй, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Папярэдзіць кіраўнікоў гаспадарчых арганізацый, што несваячасовае ўжываньне канкрэтных захадаў да правядзеньня гаспадарчага разьліку пацягне за сабою самую строгую адказнасьць.

2. Для забясьпечаньня пераходу гаспадарчых арганізацый на новыя формы крэдытаваньня, лічыць сваячасовым і мэтазгодным увядзеньне Бел. Кантораю Дзяржбанку па аднагародных разьліках сьпісаньне з рахункаў выключна ў межах свабодных лімітаў.

3. Лічыць, што адным з важнейшых мерапрыемстваў, якое забясьпечвае сваячасовы пераход гаспадарчых устаноў на новую сыстэму крэдытаваньня, зьяўляецца задача ўзмацненьня фінансавых апаратаў гаспадарчых устаноў.

Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства, ВСНГ, Белкаапсаюзу, Народнаму Камісарыяту Снабжэньня і кіраўнікам гаспадарчых устаноў вызначыць і паставіць на чале фінансавых апаратаў гаспадарчых арганізацый адказных асоб. Тэрмін выкананьня гэтага даручэньня 3 дні.

4. Даручыць гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам правесьці аналёгічныя мерапрыемствы па пераходу на новую сыстэму крэдытаваньня па лініі мясцовай гаспадаркі.

5. Папярэдзіць гарадзкія саветы і раённыя выканаўчыя камітэты аб недапушчальнасьці ўмешваньня мясцовых савецкіх органаў у апэрацыйную дзейнасьць філіялаў Дзяржбанку.

6. Катэгарычна забараніць усім мясцовым органам мабілізацыю банкаўскіх і фінансавых працаўнікоў на ўсялякія гаспадарчыя кампаніі да правядзеньня работы па пераходу на новую сыстэму крэдытаваньня.

7. Надаючы асабліва важнае значэньне паскоранаму дакумэнтазвароту, прапанаваць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў пры СНК БССР тав. Дубіне забясьпечыць чоткую і бесьперабойную работу органаў сувязі па прасоўваньні рахункаў фактур, якія накіроўваюцца ў адрас банку і гаспадарчых арганізацый.

8. Адзначаючы, што НК Працы да гэтага часу ня выканаў пастановы СНК БССР за 13 лютага 1931 г. «Пра мерапрыемствы для палепшаньня працы крэдытнай рэформы» (З. З. БССР, 1931 г., Аддзел II, № 4, паст. 52) аб узмацненьні сыстэмы Дзяржбанку рахункоўкамі працаўнікамі і аб звароце ва ўстановы Дзяржбанку банкаўскіх спэцыялістаў, якія раней працавалі ў апаратах Дзяржбанку, прапанаваць НК Працы тэрмінова выканаць гэтую пастанову, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на ўзмацненьне раённых філіялаў Дзяржбанку.

9. Камісіі Выкананьня пры СНК устанавіць сыстэматычны кантроль за правядзеньнем новай сыстэмы крэдытаваньня, даручыўшы ўсім народным камісарам і кіраўнікам гаспадарчых устаноў, не зьмяшаючы адказнасьці з апошніх, у 2-х дзённы тэрмін вызначыць адказных асоб, на ніжэй членаў калегіі, на якіх ускладаецца персанальная адказнасьць за правядзеньне новых форм крэдытаваньня ў падпарадкаваных установах і прадпрыемствах. Прозьвішча гэтых тэрмінова ў двухдзённы тэрмін паведаміць Камісіі Выкананьня.

10. Усім цэнтральным газэтам максымальна забясьпечыць разгортваньне масавай прапагандыцкай работы па папулярызацыі новых форм крэдытаваньня.

11. Даручыць Дзяржбанку арганізаваць шырокую кансультацыйную дапамогу ўсім гаспадарчым арганізацыям па пытаньнях, зьвязаных з пераходам на новыя формы крэдытаваньня.

12 Папярэдзіць кіраўнікоў усіх арганізацый, што ўся падрыхтоўчая работа па правядзеньні новай сыстэмы крэдытаваньня павінна быць скончана да 1 мая без усякіх адтэрміновак.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР
С. Кандыбовіч.

20 красавіка 1931 г.
г. Менск

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

ПРА РЭАРГАНІЗАЦЫЮ БЕЛМАЛЖЫВЁЛСАЮЗУ Ў БЕЛХЛЕБЖЫВЁЛСАЮЗ.

Для палепшаньня абслугоўваньня паляводзтва і лугаводзтва ў калгасна-каапэрацыйным і аднаасобным сэктарах сельскай гаспадаркі, Савет Народных Камісараў **пастанаўляе:**

1 Сканцэнтраваць функцыі абслугоўваньня паляводзтва і лугаводзтва калгасна-каапэрацыйнага і аднаасобнага гэктару сельскай гаспадаркі ў сыстэме малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі, у сувязі з чым пераіменаваць Белмалжывёлсаюз ў Белхлебжывёлсаюз.

2. На Белхлебжывёлсаюз ускласьці плянаваньне і кіраваньне кантрактацыяй і загатоўкай збожжа, сена, саломы, кармавых кораньплодаў, насеньня траў і сыдэральных культур.

3. У жывёлагадоўчых раёнах паказаныя у арт. 2 апэрацыі праводзяцца Белхлебжывёлсаюзам праз раённыя саюзы сельскагаспадарчай каапэрацыі самастойна, а ў раёнах іншых кірункаў сельскай гаспадаркі паводле дагавораў з цэнтрамі адпаведных сыстэм сельскагаспадарчай каапэрацыі.

4. Загатоўкі збожжа, сена, саломы і бульбы паводле пляну 1930 г. павінен закончыць Беллёканапляводсаюз.

5. Прапанаваць Белхлебжывёлсаюзу неадкладна падрыхтаваць да загатовак і збору закантрактаванага ўрэджаю 1931 году.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР
С. Кандыбовіч

20 красавіка 1931 г.
г. Менск.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

(Ад нашых карэспандэнтаў)

Рабочае шэфства ажыцьцяўляем на справе

Рабочыя заводу імя Варашылава—кіраўнікі сэктароў НКФ

Задачы поўнага выкананьня фінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі патрабуюць перабудовы форм і мэтадаў работы фінансавага апарату, наблізжэньня яго да працоўных, штодзённага рабочага кантролю і дапамогі ў паляпшэньні работы апарату. Лепшай формай масавага рабочага кантролю зьнізу зьяўляецца рабочае шэфства.

Шэф Наркамфіну—завод імя Варашылава—вылучыў шэфскія брыгады, якія ў выхадны дзень і ў вольны ад вытворчасьці час будуць практычна працаваць у адпаведных сэктарох НКФ.

Ажыцьцяўляючы рабочае шэфства, калектыў заводу імя Варашылава вылучыў нам. загадчыкаў сэктароў НКФ, якія, у парадку сацыялістычнага сумяшчэньня, будуць выконваць абавязкі па кіраўніцтве работай сэктароў.

НКФ БССР та. ХАЦКЕВІЧ у спэцыяльным загадзе прапанаваў усім работнікам НКФ стварыць найбольш спрыяючыя ўмовы для работы шэфскіх брыгад.

Рабочыя кацельнага цэху тав. ТАМАРОВІЧ назначан нам. загадчыка сэктару даходаў, рабочы ліцейнага цэху тав. РАЎБШКА назначаны нам. загадчыка сэктару абагуленьня гаспадаркі, рабочы сьлясарна-зборачнага цэху тав. ЦОФІН—на пасаду нам. кіраўніка зводна-плянавага сэктару, рабочы мэханічнага цэху МАРЦЮЩЭНКА—нам. заг. сацыяльна-культурнага сэктару і рабочы інструмантальнага цэху тав. ФАЙШТЭЙН назначан на пасаду нам. заг. арганізацыйна-інструктарскага сэктару.

Хто адкажа за зрыў курсаў?

З 12 красавіка ў м. Койданава пачаліся заняткі на двухтыднёвых курсах па аказаньні першай дапамогі захваравўшай жывёле. На гэтыя курсы зьявілася 20 калгасьнікаў, але работа на курсах праводзіцца зусім дрэнна.

Праграмы заняткаў няма, выкладчыкаў няма таксама. Райвэтдоктар, якому даручана арганізацыя і правядзень не курсаў, выехаў на раён. Курсанты фактычна прадастаўлены самі сабе і цэлымі днямі або ходзяць па мястэчку, або прыпоўпы на вэтпункт глядзяць як вэтфэльчар лечыць хворую жывёлу. Да гэтага часу з курсантамі праведзена **толькі** дзве гутаркі-лекцыі.

Пазашкольнай работы зусім не праводзіцца. Фактычна курсы сарваны. Курсанты такой падрыхтоўкай незадаволены і частка іх думае вярнуцца ў свае калгасы.

Райкалгасаюз зусім ня цікавіцца гэтымі курсамі, хоць гэта ўваходзіць у яго непасрэдныя абавязкі.

Такія курсы—толькі дарэмная трата сродкаў і рабочага часу курсантаў-калгасьнікаў. За зрыў курсаў павінен адказаць Койданаўскі Райкалгасаюз.

Л—н.

Культштаб чыгуначнага вучастку б'е трывогу

У культштабе чыгуначнага вучастку наглядаецца нездаровае зьявішча: члены культштабу, вызначаныя прадпрыемствамі, не зьяўляюцца на паседжаньні і ня прымаюць ніякага ўдзелу ў працы культштабу. Дзякуючы гэтаму, на вызначаных для іх вучастках маюцца значныя прарывы.

Прадстаўнік чыгункі, ён-жа старшыня культштабу тав. **Андрыянаў**, лічыцца толькі на паперы і ў рабоце штабу ўдзелу ня прымае. Ня ўдзельнічаюць, таксама, у рабоце штабу: т.т. **Цэхановіч, (мясцком грузчыкаў), Сільноў (Малочны завод), Гурвіч (шчотачная фабрыка), Зудэрман (Гута), ня бачылі ў штабе і прадстаўніка 3-й школы.**

Адпаведныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны прыняць належныя захады да вылучаных імі таварышоў, каб не сарваць справу ліквідацыі няпісьменнасьці і правядзеньня другога этапу культэстафэты.

Культштаб чыгуначнага вучастку.

ЗА НЯДБАЙНАСЬЦЬ У РАБОЦЕ—ПРЫМУСОВАЯ ПРАЦА. У мінулую восень праўленьне Халопеніцкага спажывецкага таварыства (Халопеніцкі раён) пастанавіла забуртаваць 4 тысячы пудоў бульбы. Праўленьне аднеслася да гэтай справы нядбайна і, ня ведаючы як робіцца буртоўка, не запрасіла спэцыялістаў-аграномаў. У выніку нядобрай забуртоўкі бульбы ў капцох згніла.

Прыгаворам Халопеніцкага нарсуду старшыня праўленьня каапэрацыі Шэлюховіч і загадчык аргаддзелам Казак за нядбайныя адносіны да справы і падрабленьне дакумантаў прысуджаны кожны на 1 год прымусовых прац і зьняцьце з работы, а загадчык гандлёвым аддзелам—Аронін за нядбайныя адносіны прысуджаны на паўгода прымусовых работ.

АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Дом Асьветы 21-га красавіка а 8 гадзіне адбудзецца **вечар яўрэйскай пралетарскай літаратуры.** Выступаюць маскоўскія яўрэйскія пралетарскія пісьменьнікі т.т. Ш. Годымэр, О. Стрэліў і Рабін І. Увечары ўдзельнічаюць пісьменьнікі: Доўгапольскі, Каган, Кульбах, Ліўшыц, Эрык, Юдэльсон, і др.

Уступнае слова мае т. Бронштэйн.

Просьба да ўсіх асьветнікаў зьявіцца сваячасова. Таксама запрашаюцца студэнты яўпэдтэхнікуму і рабочыя прадпрыемстваў г. Менску.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО

З ПАНЯДЗЕЛКА 20 КРАСАВІКА

Беларускі Другі Дзярж. тэатр	22 красавіка адкрыты спэктакль **КАЧАГАРЫ** І. ГУРСКІ. Пачатак а 8 гадзіне.
Кіно-тэатр „Культура“	**Кантакт** (Бацькі і дзеці). Пач.: 7, 8.45 і 10.30 — Хроніка Белдзяржкіно № 7
„Чырвоная Зорка“	Новы мастацкі фільм **Суд павінен працягвацца** Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса адч. з 5 г.
Кіно інтэрнацыянал	Замежны фільм **Апошнія навіны** Звыш праграмы кіно хроніка № 14 Саюзкіно Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г. 30 хв.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“	Драма ў 6 ч. **Начны рамізьнік.** Пачатак а 6 гадз.
Кіно „Юны Піянэр“	**Дзяўчына з палубы.** Кіно-хроніка № 16 Пачат. сэансу а 1 г. дню. Каса адч. з 11 г.

У ПЛЯН ПЕРАВЫБАРАЎ ГАРСАВЕТУ

ЎНОСЯЦЦА НАСТУПНЫЯ ЗЬМЕНЫ:

1. Утрыманцы вайскова-служачых часьцей Менскага гарнізону абіраюць ня ў клюбе гарсавету 26-IV а 19 гадз.,

а ў Доме Чырвонай арміі 28 красавіка а 20 гадз.

2. Утрыманцы рабочых і служачых заводу „Полымя Рэвалюцыі“ і Белмэталяаб'яднаньня абіраюць ня ў клюбе мэталістаў а 19 г. 28 красавіка,

а ў клюбе Ільліча ў той самы дзень і гадзіну.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе 1-го дакуманту **1 руб.**

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

СЭКТАР КНІГАРАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ.

Да 1 мая і другога году сацспаборніцтва.

1. Амосаў.—Транспарт на рэйкі ўдарні тва. Цана 10 к., тыраж 3.000.
2. Анцаў.—Першае мая (ноты). Цана 20 кап., тыраж 1.500.
3. Булах.—Год вялікага пералому і вытворчасьць. Цана 15 кап., тыраж 5.000.
4. Вілін.—На змаганьне за якасьць прадукцыі. Цана 15 к., тыраж 5.000.
5. Васкабойнікаў і Курцін.—На барацьбу за прамфінплян. Цана 20 к., тыраж 10.000.
6. Гарбуноў і Салдаценка.—Рапарт пераморг. Цана 20 к., тыраж 10.000.
7. Данілевіч.—Рацыяналізацыя і змаганьне са стратамі на вытворчасьці. Цана 30 к., тыраж 5.000.
8. Зборнік. — Два гады пяцігодкі. Цана 17 к., тыраж 8.000.
9. Зборнік.—На парозе 14 га году. Цана 30 к., тыраж 7.000.
10. Зборнік.—Замежныя комсамольцы пішуць. Цана 70 к., тыраж 3.000.
11. Захер. — Рэвалюцыя 1848 г. у Францыі. Цана 1 р. 12 кап., тыраж 3.000.
12. Іванія —За савецкі Кітай. Цана 55 к., тыраж 4.000.
13. Іозэф — Клясы партыі і саюзы моладзі ў Вэнгрыі. Цана 15 к., тыраж 3.000.
14. Канаплін.—Фашызм і фашыцкая дзяржава. Цана 1 р. 55 кап., тыраж 3.000.
15. Клімчук.—Энтузіясты. Цана 60 к., тыраж 3.000.
16. Кулзінаў—Што даў калгас аднаасобнікам. Цана 10 к., тыраж 50.000.
17. Кудзі аў.—Калгаснае будаўніцтва. Цана 63 к., тыраж 3.000.
18. Лоры і Ліўшыц.— Пяць год. Цана 55 к., тыраж 5.000.
19. Накоракаў.—Сымонкін першамай. Цана 20 к., тыраж 5.000.
20. Розэнберг.—Энтузіястыя працы. Цана 15 к., тыраж 5.000.
21. Садоўсці. — Рукамі ўдарнікаў. Цана 25 к., тыраж 3.000.
22. Шмідт.—Ударнікі палёў. Цана 10 к., тыраж 7.000.
23. Шатэрніч і Шніц р. Першае мая ў піянэрскім атрадзе. Цана 15 к., тыраж 3.000.

Прадаюцца ва ўсіх кнігарнях Белдзяржвыдавецтва, спажыўкаапэрацыі і Саюздруку.

Аргбюро ЦСПСБ саюзу работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю паведамляе, што

1-шы ўсебеларускі зьезд работнікаў каапэрацыі і дзяржгандлю

адкрываецца 21 красавіка, у 7 гадз. веч. [illegible] клюбу саўгандальслужачых (роз[illegible]).

Фракцыя зьезду адбудзецца ў [illegible]

Рэгістрацыя дэлегатаў будзе праводзіцца ў памяшканні [illegible] служачых: Дом Працы, 3 паверх, пакой № [illegible] зьезду ў памяшканьні клюбу ад 5 да 7 г. [illegible] На зьезд запрашаюцца работчыя, што шэфствуюць над гандлёва-каапэрацыйнымі [illegible]

БЕЛДЗЯРЖКІНО

паведамляе,

што з 20 красавіка **ЗЬМЕНА ПРАГРАМ**

ва ўсіх кіно-тэатрах гор. Менску **ПЕРАВОДЗІЦЦА** на дэкадную і пяцідзённую сыстэму

Праграмы карцін мяняюцца 5, 10, 15, 20, 25 і 30 КОЖНАГА МЕСЯЦА.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА МАЙ І ДАЛЕЙШЫЯ МЕСЯЦЫ **1931 Г.**

НА ГАЗЭТУ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“

Орган ЦВК і СНК БССР

Падпіска прымаецца выключна на пошце да 27 чысла.

ЗГУБЛЕНЫ:

Мэтрычны выпіс Шустэр С. Ю., выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 34.

Даведка ў замен сяброўскай кніжкі Найгарт Л., выд. Саюзам Саўгандальслужачых, квіт. 37.

Сяброўская кніжка Мувеза М. Н., выд. Саюзам мэталістаў, квіт. 33.

Выпіс аб шлюбе Валярпола І. Б., выд. Менскім ЗАГС-ам квіт. 38.

Вайсковая кніжка Аўчыньнікава В. М., выд. Менакрваенкаматам. нарад. 1903 год., квіт. 78.

Чырвонаармейская кніжка Вярнікоў С. В., выд. 5 стр. полка праз Койдаўскае РВК, квіт. 79.

Шлюбная выпіс Алехновіча С., выд. Менскім ЗАГС-ам, кв. 80.

Паявая кніжка Станкевіча С., выд. Земляробам, квіт. 81.

Мэтрычны выпіс Рохкінд Ф Ф. выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 83.

Сяброўскі білет за № 13000 Дробкіна Ш. А. выд. саюзам Саўгандальслуж., квіт. 82.

Вайсковая кніжка Гамера Я. Б., выд. Менакрваенкаматам нарадж. 1902 г. квіт. 84.

Пашпарт Шэрамецьева Г. М. выд. Каржыскім с/с, Каменскага раёну, квіт. 85.

Вайсковая кніжка Карпа А. Л., выд. Менакрваенкаматам, квіт. 86.

Вайсковая кніжка Мая С. М., выд. Менакрваенкаматам, квіт. 87.

Паявая кніжка за № 2342 Барбоса М. А., выд. Дрысенскім спажыў. т-вам, квіт. 88.

Сяброўскі білет Івашкевіча за № 6/26685, выд. Мазырскім акруговым саюзам будаўнікоў у 1927 годзе, квіт. 89.

Мэтрычны выпіс Панцюхова Р, Ф., выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 90.

Пашпарт Казарскай Л І., выд. Менакрміліцыяй, квіт. 91.

Даведка Марголінай Р. Е. выд. Менакрміліцыяй, квіт. 93.

Даведка аб працы чорнарабочага Гітліна М. Ш., выд. МЦРК, квіт. 92.

Пашпарт Марголінай Р. Е. выд. Менакрміліцыяй, квіт. 93.

Мэтрычны выпіс Камінскага Я. Н. выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 94.

Пашпарт Іоселева Ш. Г. Х. выд. 1-м аддз. Менакрміліцыі 27/1-30 г. за № 1863544, квіт. 95.

Нарсуд Крупскага раёну, на падставе прысуду ад 12-га сакавіка г. г., за самаўладзтва, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне былы прамаўніку Крупскага Райпо Егудасману Якубу Ісаку.

Нарсуд Крупскага раёну, на падставе прысуду ад 19-III-31 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену с-с пас. Крупка Ермаловічу Міхасю Фролову за тое, што ён у сьнежні месяцы 1930 г. склаў хлусьлівы акт тым, што у пас. Крупка невядома кім застаўлена дзіця 3-х месячнае, тады як ён добра ведаў, што дзіця пр. пас. Крупка Навахроста Яна; гэта ім зроблена для таго, каб Навахросту да бацца здачы гэтага дзіцяці ў дзіцячы дом.

Нарсуд Хойніцкага раёну, на падставе прысуду ад 24-га сакавіка г. г. па арт. 196-213 КК за непадачу касавага пляну на сьнежань месяц 1929 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне бухгальтэру Хойніцкага Райбанка Грабоўскаму Файвелю Майсееву.

Нарсуд Крупскага раёну, на падставе прысуду ад 26-III-31 г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену Шэйскага с-с Філімонаву Сьцырыдону за нядбайныя адносіны да выкананьня службовых абавязкаў, дзякуючы чаму па вёсцы Сінчанка усе віды загатовак прышлі з спазьненьнем.

Нарсуд Крупскага раёну, на падставе прысуду ад 8-га студзеня г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Крупскага Райкалгасаюзу Казлоўскаму Зьмітру Антонаву і інструктару таго-ж калгасаюзу Пыжыку Алесю Х. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Хойніцкага раёну, на падставе прысуду ад 19-га лютага г. г. па арт. 196-213 КК, за нядбайныя адносіны да пастаноўкі працы, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку Хойніцкага аддзяленьня скурсындыкату Гіпліну Ісаку Самойлаву.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, д. № 17, першы паерх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
Падпісная плата 1 месяц—90в кап., 3 м-цы—2,70, 6 м-цаў—4,00 на год—8,00.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.